

УНУТРАНЫ ПОПЫТ НА ІНФЛЯЦЫЮ НЕ ЦІСНЕ

2

ДАРОГА Ў ШКОЛУ




МС

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЛЮТАГА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 26 (28893)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:**

*«Новых пагроз для нацыянальнай бяспекі ў сувязі з выхадам ЗША з Дагавора аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці не з'явілася. Як вядома, ЗША пачалі выхад з пагаднення 2 лютага, гэты працэс зойме паўгода. Расія мае намер адпаведна адказаць на дзеянні ЗША. Мы будзем умацоўваць свае Узброеныя Сілы, умацоўваць абараназдольнасць краіны, дзяржаўнасць, саюз Беларусі і Расіі — усё гэта трэба рабіць».*

## КОРАТКА

- **Беларусы ў студзені прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на $683,3 млн у эквіваленце, купілі на $677,5 млн.**
- Каля 1 тыс. ваеннаабавязаных прызвана з запасу ва УС Беларусі падчас комплекснай праверкі гатоўнасці.



- **Больш як 1,3 млн электронных рэцэптаў выпісана летась у Гомельскай вобласці.**
- Апраўдальныя прысуды ў дачыненні да 80 чалавек вынесеныя ў 2018 годзе.
- **Зборная Беларусі па футболе займае 78-е месца ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (FIFA).**
- Інтэрнэт-махляр пад легендай марака з ЗША атрымаў ад жыхаркі Барысава больш як $41 тыс.

# КАШТОЎНЫ РУБЕЛЬ

## Уклад Нацбанка ў фінансавую стабільнасць краіны...

**...адзначыў Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы са старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Паўлам Калаурам.**

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў спакой на фінансавым рынку і адсутнасць насцярожанасці ў сувязі з гэтым у грамадстве.

«Як бы ў нас хто ні падкрытыкоўваў тое, што было, і тое, што ёсць, — гэта неба і зямля. Можа, камусьці не падабаецца занадта жорсткая фінансавая палітыка ў дзяржаве, але яна накіравана на захаванне стабільнасці», — адзначыў беларускі лідар.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# «ЗАЛАТАЯ» НАША САША

## Беларуска стала чэмпіёнкай свету, апярэдзіўшы лыжных акрабатак з Кітая і Расіі

**Фрыстайлістка Аляксандра РАМАНОЎСКАЯ лёгка пераадолела кваліфікацыю, выйшла ў фінал, а потым і ў суперфінал, дзе сур'ёзна па балах апярэдзіла сваіх саперніц. Пасля прызямлення і погляду на табло са сваімі ацэнкамі Саша не змагла стрымаць слёз, Любоў Нікіціна, якая стала другой, і Ксю Ментаа, якая стала трэцяй, заключылі беларуску ў цёплыя абдымкі.**




Фота БелТА.

Пасля ўзнагароджвання Аляксандра сказала: *«Я выйграла за сябе і за таго хлопца. Будзем лічыць, за нашых дзяўчат, за Аню і Алу»*. Сапраўды так, бо ў амерыканскі Дзір-Вэлі наша каманда адправілася ў няпоўным складзе. Алімпійская чэмпіёнка Ганна Гуськова яшчэ аднаўляецца пасля траўмы, але, вядома, Аня ўсё роўна глядзела трансляцыю з чэмпіянату і адразу пасля перамогі ў сацсетках павіншавала сваю сяброўку па камандзе.

Для Аляксандры Раманоўскай гэта «золата» стала першым на дарослым чэмпіянаце свету, раней беларуска двойчы перамагала на юніёрскім першынстве планеты.

СТАР. 3

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Аляксандру Раманоўскую з бліскучай перамогай на чэмпіянаце свету. «Ты настойліва і ўпарта ішла да гэтага выніку. А цудоўны фінальны скачок у амерыканскім Дзір-Вэлі не пакінуў ніякіх сумненняў: ты найлепшая!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**

**У віншаванні гаворыцца, што гэтая перамога чарговы раз пацвярджае, што ў Беларусі створана школа лыжнай акрабатыкі сусветнага ўзроўню, якая ўжо не адно дзесяцігоддзе забяспечвае падрыхтоўку таленавітай моладзі.**

**«Шчыра жадаю табе, усёй камандзе і трэнерскаму складу моцнага здароўя і новых дасягненняў!» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

# ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ КАЦІ

## Трэба не адчайвацца, а шукаць у сабе сілы, упэўнены яе родныя

**Тры гады таму 9-гадовую Кацю Іванову, якая вярталася са школы з суседняй вёскі Крупіца Мінскага раёна, збіў аўтамабіль. Кома, клінічная смерць, сем аперацый, у тым ліку выдаленая нырка, і пагроза ампутацыі нагі — і ніякіх прагнозаў на будучыню. Аднак гэта гісторыя не пра жыццёвую несправядлівасць і адчай, якіх тут таксама хапіла, а пра надзею, стойкасць і перамогу над самім лёсам. Каця не толькі выйшла з комы, але і насуперак дыягназам нанова навучылася хадзіць, размаўляць, чытаць і пісаць і нават вярнулася да вучобы...**

СТАР. 4



Фота Андрэя САЗОНАВА.

ISSN 1990 - 763X

# КАШТОЎНЫ РУБЕЛЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, работнікі Нацыянальнага банка заслугоўваюць падзякі. Ён нагадаў Паўлу Калауру, што той нясе за гэта персанальную адказнасць, і заклікаў знаходзіць агульную мову з кіраўнікамі камерцыйных банкаў, выбудаваць бяспечную работу ў сферы фінансаў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Нацыянальны банк бачыць неабходнасць узмацнення фінансавай сістэмы краіны ў рамках сусветнай практыкі. «Каб узмацніць гэтую фінансавую стабільнасць, патрэбны нейкія дадатковыя змены ў нашым заканадаўстве. Якія — я хацеў бы пачуць для таго, каб уяўляць, што мы будзем рабіць, прымаем мы прапановы Нацыянальнага банка або не, але тое, што даложана мне, я абсалютна падтрымліваю», — сказаў ён.

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел Калаур не стаў падрабязна спыняцца на выніках мінулага года і адзначыў толькі тое, што ў краіне забяспечана і цэнавая, і фінансавая стабільнасць як базавыя ўмовы для таго, каб у Беларусі забяспечваліся эканамічны рост і павышэнне дабрабыту грамадзян.

## Стабільнасць — прыкмета майстэрства

Па выніках сустрэчы з кіраўніком дзяржавы Павел Калаур пагутарыў з журналістамі.

Ён адзначыў, што перад Нацыянальным банкам і ўрадам на бягучы год стаяць больш амбіцыйныя задачы ў цэлым па забеспячэнні макраэканамічнай збалансаванасці. І гэта асабліва важна ва ўмовах тых выклікаў і геапалітычных нявызначанасцяў, якія назіраюцца ў свеце.

«Вяртаючыся да пытання аб фінансавай стабільнасці, хочацца адзначыць, што гэта вельмі важны элемент у цэлым макраэканамічнай палітыкі, і, вядома, гэтаму пытанню была ўдзелена сёння асаблівая ўвага, — расказаў старшыня праўлення Нацбанка. — Нам важна разумець, што фінансавая стабільнасць — гэта не проста ўстойлівасць на бягучым моманце банкаўскай сістэмы, іншых фінансавых пасярэднікаў, фінансавых рынкаў, аплатнай сістэмы, але гэта такі стан усіх гэтых кампанентаў, які дазваляе заставацца ўстойлівым, нават калі будуць нейкія знешнія шокі».

Кіраўнік галоўнай фінансавай установы падкрэсліў: сістэма павінна ўмець адказваць на выклікі, каб захаваць устойлівы эканамічны рост. Паводле яго слоў, кіраўнік дзяржавы падтрымаў ініцыятыву Нацыянальнага банка ў гэтым кірунку, паколькі ўжо на сёння ў заканадаўстве ён, як кіраўнік Нацбанка, нясе персанальную адказнасць за забеспячэнне фінансавай стабільнасці.

За Нацбанкам ужо сёння замацавана функцыя маніторынгу фінансавай стабільнасці — гэта аналіз. «Мы прапанавалі, каб быў не проста маніторынг, а адказнасць Нацыянальнага банка за забеспячэнне фінансавай стабільнасці, — адзначыў Павел Калаур. — Безумоўна, для гэтага патрэбны і інструменты. Гаворка ідзе пра макрапрудэнцыяльнае рэгуляванне, палітыку і адпаведныя інструменты, якія падтрымлівалі б гэтую палітыку».

Міжнародная практыка ведае цэлы шэраг такіх інструментаў, некаторыя ў Беларусі ўжо задзейнічаны. У прыклад старшыня праўлення Нацбанка прывёў абмежаванне пазыковай нагрузкі на фізічную асобу, калі яна бярэ крэдыты. Гэта накіравана на тое, каб засцерагчы насельніцтва ад залішняй закрэдытаванасці.

Што датычыцца пераходу Нацбанка на таргетаванне інфляцыі, то гэта таксама робіцца ў рамках забеспячэння дасягнення мэты па цэнавай стабільнасці.

Такім чынам, у гэтым кірунку Нацбанк адпрацуе разам з урадам усе падыходы і ўнясе адпаведныя дакументы для прыняцця рашэння кіраўніком дзяржавы.

## Пашырыць сферу выкарыстання нацыянальнай валюты

Вяртаючыся да тэмы 25-годдзя беларускага рубля, Павел Калаур звярнуў увагу на ўпэўненасць Нацбанка ў тым, што зараз прыйшоў той перыяд, калі трэба крыху шырэй і глыбей пагаварыць пра давер да сваёй нацыянальнай валюты.

«У нас былі розныя перыяды. Гістарычная памяць, безумоўна, у насельніцтва прысутнічае, але мы апошнія чатыры гады разам з урадам дэманстравалі, што пастаўленыя мэты па забеспячэнні цэнавай стабільнасці выконваюцца. Мы ў стане гэта ўсё забяспечваць, — падкрэсліў ён. — І безумоўна, гэта дазваляе захаваць пакупную здольнасць нацыянальнай валюты. У гэтым кантэксце вельмі важна заўважыць тое, што неабходна, каб было паважлівае стаўленне да сваёй нацыянальнай валюты, каб пашырылася сфера прымянення нацыянальнай валюты».

Па словах старшыні праўлення Нацбанка, не павінна быць выкарыстання замежнай валюты ў разліках унутры краіны, таму што ёсць свой законны аплатны сродак — гэта беларускі рубель. «Мы павінны, як і калісьці заўважыў, адыходзіць ад гэтых рудыментаў, якія так ужо гістарычна ў нас склаліся, быў такі няпросты перыяд», — дадаў ён.

Кіраўнік галоўнай фінансавай установы Беларусі таксама расказаў, што Нацбанк падрыхтаваў праект закона аб валютным рэгуляванні, які адлюстроўвае ліберальныя падыходы ў гэтай частцы. «Мы ад забароннай сістэмы павінны перайсці да сістэмы валютнага маніторынгу, дазвольнай сістэмы. З іншага боку, у гэтым законе яквраз і прадугледжаны пытанні забароны выкарыстання замежнай валюты для разліку ўнутры краіны, — адзначыў спецыяліст. — Мы разлічваем, што ўжо дзесьці ў наступным годзе гэты закон будзе прыняты і пачынаючы з першага студзеня 2021 года ў нас будзе сучасная сістэма валютнага рэгулявання, якая адпавядае найлепшай міжнароднай практыцы».

Гэты закон цяпер знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе.

Там жа знаходзіцца праект указа па рабоце з праблемнымі актывамі, праводзіцца абмеркаванне з зацікаўленымі ведамствамі. «Мы разлічваем, што ўжо ў першай палове гэтага года мы маглі б па гэтым пытанні вызначыцца», — сказаў ён.

На яго думку, гэты ўказ закране шэраг аспектаў — гэта пытанні пашырэння даступнасці да фінансавання якраз у першую чаргу малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Гаворка ідзе пра выкарыстанне ў беларускім заканадаўстве міжнароднай практыкі, якая завязана на забеспячальніцкіх здзелках, калі прыярытэт пры спрэчках — у тым ліку пры банкруцтве — аддаецца абавязацельствам, якія забяспечаны закладамі, акцыямі. Такая практыка сведчыць аб тым, што краіны, якія адважыліся на такія змены, атрымалі дадатковую магчымасць для фінансавання малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Павел Калаур звярнуў увагу, што неабходна раскрыць больш інфармацыі пра тое, якія ў нас былі этапы станаўлення нацыянальнай валюты, Нацыянальнага банка як інстытута ў незалежнай дзяржаве. Будуць праводзіцца мерапрыемствы з гэтай мэтай. Акрамя таго, у бягучым годзе ў Беларусі з'явяцца абноўленыя банкноты пяць і дзесяць рублёў, манеты наміналам у адну і дзве капейкі, два рублі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Фінансы

# СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ПАКУЛЬ НЕ МЯНЯЕЦЦА

**Аб гэтым паведаміў на брыфінгу старшыня праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР пасля штоквартальнага пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы.**




### Два асноўныя рашэнні

Ён, у прыватнасці, зазначыў, што праўленнем прыняты два ключавыя рашэнні. Першае — захаваць нязменнымі стаўку рэфінансавання і стаўку па пастаянна даступных аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў. Гэта 10 і 11,5 працэнта гадавых адпаведна.

Другое з'яўляецца, хутчэй, тэхнічным: павысіць з 13 лютага гэтага года стаўку па дэпазітах авернайт на 0,5 працэнтнага пункта да 8,5 працэнта гадавых. Дадзенае рашэнне прынята ў рамках планамернай працы па зніжэнні валацільнасці (зменлівасці) працэнтных ставак на крэдытна-дэпазітным рынку. Цяпер калідор працэнтных ставак па аперацыях рэгулявання ліквіднасці стане сіметрычным адносна стаўкі рэфінансавання. Гэта дазволіць узмацніць значнасць апошняй у механізме грашова-крэдытнай палітыкі.

### Унутраны попыт на інфляцыю не ціснe

Пры прыняцці рашэння аб стаўцы рэфінансавання кіраўніцтва рэгулятара імкнулася ўлічыць увесь спектр знешніх і ўнутраных умоў, якія ўплываюць на дасягненне мэтавага параметра па інфляцыі на 2019 год.

Летась пры вызначаным мэце не больш за 6 працэнтаў мы дасягнулі 5,6 працэнта. Цяпер стаіць задача пакінуць інфляцыю па выніках года ў межах 5 працэнтаў. Калі шэраг унутраных фактараў кажа аб магчымасці асцярожнага зніжэння працэнтных ставак, то знешнія ўмовы паказваюць нявызначанасць і цягнуць за сабой адпаведныя рызыкі.

«Мы бачым, што з боку ўнутранага попыту адсутнічае значны інфляцыйны ціск», — заявіў Павел Калаур. Паводле яго слоў, эканамічны рост паступова запаволіўся пасля завяршэння фазы аднаўлення. Набывае больш умераны характар спажывецкая актыўнасць.

Рэальны курс беларускага рубля застаецца на сваім раўнаважным узроўні. Працэнтныя стаўкі адпавядаюць макраэканамічнай сітуацыі, улічваюць рызыкі з боку знешніх шокаў і ўзровень інфляцыйных чаканняў. Дынаміка грашовага прапанавання, з аднаго боку, забяспечвае падтрыманне цэнавай стабільнасці, а з другога — не аказвае стрымліваючага ўплыву на дзелавую актыўнасць.

### Дарагое мяса і рост заробкаў

Разам з тым ёсць шэраг фактараў, якія з'яўляюцца праінфляцыйнымі, лічыць старшыня праўлення.

Напрыклад, неспрыяльная кан'юнктура рынку сельскагаспадарчай прадукцыі, якая прывяла да паскоранага росту цэн на мяса. Адбіваецца хуткі рост заработных плат у канцы 2018 года. Уплыў на інфляцыю назіраецца з боку павышэння ўнутраных цэн на паліва, якое ў тым ліку прывяло да павелічэння выдаткаў вытворцаў.

У той жа час, на думку экспертаў Нацбанка, уплыў дадзеных фактараў з'яўляецца часовым. Іх дзеянне захаваецца ў пачатку гэтага года. Паводле ацэнак, інфляцыя ў першай палове года будзе перавышаць усталяваны на 2019 год мэтавы параметр. Гэта звязана з тым, што негатыўны ціск з боку часовых фактараў, якія ўжо дзейнічаюць, не знікне ў адно імгненне. Хоць паступова іх уздзеянне будзе згасаць.

Паводле ацэнак Нацбанка, праінфляцыйны ўплыў шоку цэн на мяса і мясапрадукты сыдзе да другой паловы бягучага года. «У пацвярджэнне гэтага мы ўжо назіраем некаторае запаволенне інтэнсіўнасці росту цэн на тавары дадзенай групы».

Што датычыцца заработнай платы, то пасля высокіх тэмпаў яе росту ў канцы 2018 года далейшы рост чакаецца на ўзроўні, які адпавядае павышэнню прадукцыйнасці працы. Таму дадзены фактар не будзе мець працяглага інфляцыйнага эфекту.

Такім чынам, дзеянне часовых і кан'юнктурных інфляцыйных фактараў у другой палове года будзе сыходзіць. На фоне збалансаванага росту ўнутранага попыту грашова-крэдытная палітыка захавае свой нейтральны характар. У выніку інфляцыя замарудзіцца да значэнняў, вызначаных мэтавым параметрам.

Але істотны ўплыў на інфляцыю аказваюць знешнія фактары. Гэта павышаны інфляцыйны фон у Расіі ў сувязі з павелічэннем ПДВ. У той жа час ціск на нашы цэны ад расійскай інфляцыі будзе зніжацца, паколькі, па нашых меркаваннях і па прагнозах Банка Расіі, рост цэн замарудзіцца ў другой палове 2019 года.

Аднак нельга выключыць пагаршэнне эканамічнага становішча ў гэтай краіне, перш за ўсё з-за развіцця сітуацыі з санкцыямі ў дачыненні да яе эканомікі. Магчымы адток капіталу можа прывесці да паслаблення расійскага рубля, што стане фактарам паскарэння інфляцыйных працэсаў у Расіі.

### Па рублёвых дэпазітах — ужо без абмежаванняў

Каментуючы рашэнне Нацбанка аб зняцці абмежаванняў гранічных працэнтных ставак па рублёвых дэпазітах, Павел Калаур адзначыў, што гэта «можа прыводзіць да розных сітуацый». «Але мы не чакаем нейкага значнага адхілення або вагання працэнтных ставак», — дадаў ён.

Рынак павінен сам вызначаць раўнаважны ўзровень ставак. Асабліва гэта датычыцца нацыянальнай валюты, для таго каб належным чынам працаваў трансмісійны механізм грашова-крэдытнай палітыкі. Гэта трэба таксама для таго, каб кіраўніцтва Нацбанка магло прымаць адпаведныя правільныя рашэнні па стаўцы рэфінансавання і па іншых працэнтных стаўках.

«А па валютных укладах, мы лічым, на дадзеным этапе заўчасна адмяняць гэтыя рэкамендацыі па абмежаванні гранічных працэнтных ставак. Паглядзім, як рынак будзе працаваць далей з гэтым механізмам», — сказаў старшыня праўлення.

### Давер трэба заслужыць

І яшчэ. Фінансавы рэгулятар пачаў распрацоўку стратэгіі павышэння даверу да нацыянальнай валюты.

Яна прадугледжвае ў абавязковым парадку і адказнасць Нацбанка па забеспячэнні фінансавай стабільнасці. Гаворка ідзе аб павелічэнні долі нацвалюты ў разліках і ў балансах камерцыйных банкаў.

Павел Калаур адзначыў, што заўчасна казаць аб крытэрыях, якія будуць вызначаны ў стратэгіі. «Пакуль зафіксавалі адзін паказчык: аб'ём крэдытаў у нацыянальнай валюце павінен быць не меншы за 50 %», — удакладніў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПІСЬМЕННІКІ З РОЗНЫХ КРАІН СУСТРЭЛІСЯ Ў МІНСКУ

**Ужо традыцыйна на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая праходзіць гэтымі днямі, адбываўся і міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Аўтары са шматлікіх краін сабраліся разам, каб абмеркаваць тое, што набалела кожнаму, каб падзяліцца агульнымі дасягненнямі. Гаварылі і пра сучасныя тэхналогіі — і іх службу літаратуры, — і пра складанасць выхавання маладога пакалення, і пра важнасць культурнага ўзаемаўзбагачэння розных краін.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— Мы вельмі ўдзячны ўсім літаратарам, якія працуюць у рэгіёнах і прадстаўляюць беларускую літаратуру. Прыклад таму — некалькі кніг, якія выйшлі апошнім часам. Гэта анталогія беларускай літаратуры, што выйшла на рускай мове. Яна пабачыла свет і ў Чувашыі, і ў Татарстане. Адам Ахматукаеў актыўна прапагандуе беларускую літаратуру на старонках часопісаў, якія выходзяць у Чачэнскай Рэспубліцы. Варта адзначыць, што многія прадстаўнікі розных літаратур прадстаўлены ў беларускім альманаху «Далягляды». На яго старонках знайшла месца літаратура Злучаных Штатаў, Кітая, Расіі, Францыі, Германіі, Італіі, Польшчы, Ізраіля, Сербіі, Эквадора, Украіны, Літвы, Азербайджана, Туркменістана, Узбекістана, Бангладэш і Венесуэлы. Гэтыя творы, што былі перакладзены ў апошнія гады. Альманах нарадзіўся дзякуючы Марыі Кобец, Юліі Алейчанцы, Івану Чароту, Андрэю Касцюкевічу, Яне Явіч, Міколу Мятліцкаму. Дарэчы, апошняга варта віншаваць і з яшчэ адной перакладной кнігай — кітайскага паэта Ай Цінь.

Пра важнасць перакладаў і ўзаемаперакладаў гаварылі і іншыя ўдзельнікі сімпозіума. Так, **астраханскі паэт, перакладчык Юрый ШЧАРБАКОЎ** расказаў:

— Мы з беларускім паэтам Міхасём Пазняковым пераклалі адзін аднаго. І абедзве кнігі нядаўна пабачылі свет. Гэта, гучна кажучы, прыклад тых самых гарызантальных літаратурных сувязяў, без якіх у наш час не абысціся. Я шчыра лічу, што сёння для літаратара няма больш важнай справы, чым удзел ва ўзаемапранікненні і ўзаемаўзбагачэнні літаратур, а значыць, і культур народаў.

Госць з Італіі, у сваю чаргу, расказаў, што ўжо пэўны час жыве ў Беларусі, таму паспеў напоўніцу спазнаць тут нашу гасціннасць. І гэта яшчэ больш натхніла яго на тое, каб па вяртанні папулярызаваць беларускую літаратуру ў сябе на радзіме.

— Я ўжо паўтара года жыву ў Беларусі. І кожны дзень з вялікім задавальненнем адкрываю шмат новых рэчаў і новых цудоўных якасцяў вашага народа, — адзначае **Гафрэда МУРАТДЖА, паэт з Італіі.** — З самага пачатку я адчуваў сябе вельмі добра. Хачу адзначыць, што такое паняцце, як гасціннасць, тут прысутнічае ў вельмі значнай меры — сустракаю яго ў душах усіх беларусаў. Таму, калі я вярнуся на радзіму, мне насамрэч будзе вельмі цікава паглядзець, а што ў Італіі ведаюць пра беларускую літаратуру? Думаю, што стымулам да гэтага паслужыць і цікавы вопыт удзелу ў міжнародным сімпозіуме літаратараў.

Дарэчы, згадаўшы пра гасціннасць, я адразу задумаўся пра агульную канцэпцыю паняцця «пісьменнік і час». Я хачу крыху сказаць пра адносіны пісьменніка і часу ў Італіі. У нашай краіне даволі вострa абмяркоўваецца, наколькі пісьменнік абавязаны быць прадстаўніком свайго часу з палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага, маральнага пунктаў гледжання? Пачынаючы ад Вергілія і да аўтараў нашага часу, заўсёды задавалася пытанне, наколькі пісьменнік павінен быць удзельнікам сучасных яму падзей? Не так даўно выйшлі два вялікія артыкулы вядомага італьянскага літаратуразнаўцы Сабіяна Веранэзі, якія акурат закранулі пісьменнікаў выступіць фронтам вакол актуальнай для Італіі праблемы іміграцыі. Але і тут не ўсё адназначна.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

***Больш падрабязна пра міжнародны сімпозіум літаратараў чытайце ў заўтрашнім нумары «Звязды».***

## ВАМ АДКАЖУЦЬ КАМПЕТЭНТНЫЯ АСОБЫ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 9 лютага ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў краіны з 9 да 12 гадзін адкажуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч КАРОЦІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

## Сонейка прыгрэла. Ці надоўга?

У нядзелю і панядзелак удзень будзе трымацца плюсавая тэмпература

**Тэмпературны фон у краіне ў пачатку лютага недзе на 3—5 градусаў вышэйшы за кліматычную норму, ды і ў выхадныя дні павышаны тэмпературны рэжым захаваецца, адзначаюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень пад уплывам малаактыўнага франтальнага раздзела ў асобных раёнах пройдзе невялікі мокры снег. На асобных участках дарог будзе галалёдзіца. А вось заўтра ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя мокры снег або дождж, днём па паўночным захадзе яны будуць суправаджацца парывістым ветрам. Месцамі чакаецца слабы туман. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад нуля да мінус 6 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях яна панізіцца да 8 марозу. Днём тэмпература прагназуецца ў межах ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла.

У нядзелю ўначы тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальнага раздзела. Удзень надвор'е будзе вызначаць цёплая вільготная паветраная маса, якая паступае з поўдня Еўропы. Таму ўначы на большай частцы нашай тэрыторыі, а ўдзень у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж), уначы і раніцай месцамі з парывістым ветрам. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 5 — плюс 2 градусы, удзень — ад нуля да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак умовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу, па паўночным усходзе краіны з мокрым снегам. У асобных раёнах прагназуецца туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а ўдзень па-веснавому прыгрэе сонца і будзе наогул 1—7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «ЗАЛАТАЯ» НАША САША

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У актыве Сашы таксама першае месца на этапе Кубка свету ў студзені 2015 года ў Лэйк-Плэсідзе (ЗША). *«Больш за ўсё рада за нашу каманду, якая даказала, што беларусы па-ранейшаму самыя моцныя на планеце,* — адзначыла Аляксандра. — *Так атрымалася, што з-за траўмаў дзяўчаты засталіся дома і мне прыйшлося ваяваць, па сутнасці, у адзіночку. Было трохі боязна, але гэта і надавала сіл. Хачу сказаць вялікі дзякуй нашым трэнерам і ўсёй камандзе — яны сёлета ўжо пакажуць у гэтым сезоне, можаце не сумнявацца! Таксама хачу падзякаваць балельшчыкам, я адчувала вашу падтрымку за тысячы кіламетраў. І вельмі рада, што наш сцяг сёння падняўся вышэй за ўсіх!»* Асобнае павіншаванне Саша адрасавала свайму тату і павіншавала яго з днём нараджэння. *«Я вельмі старалася зрабіць табе падарунак. Ты — найлепшы»*, — сказала Саша.

Аляксандра Раманоўская нарадзілася ў Мінску, зараз дзяўчыне 22 гады. На лыжы Сашу паставіла мама, якая сама займаецца лыжным спортам. Раманоўская дэбютавала ў Кубку свету ў 2012 годзе, з тых часоў дзяўчына ўжо некалькі разоў падымалася на п'едэстал. У 2018 годзе Аляксандра выступіла на Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане, аднак абедзве яе спробы там былі няўдалымі. Сашына захапленне — татуіроўкі, на яе целе ўжо больш за пяць малюнкаў, і на гэтым дзяўчына не збіраецца спыняцца.

Адзначым таксама, што прадстаўнікам мужчынскай часткі каманды на п'едэстал чэмпіянату свету падняцца не ўдалося. Алімпійскі чэмпіён Сочы Антон Кушнір заняў у Дзір-Вэлі восьмае месца, Дзмітрый Мазуркевіч у выніковым пратаколе 16-ы, Максім Гусцік стаў толькі 20-м. Сёння ночку на турніры прайшлі камандныя спаборніцтвы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Telegraph: Мэй рыхтуецца перанесці паўторнае галасаванне па здзелцы аб «Брэксіце»

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй рыхтуецца перанесці паўторнае галасаванне ў парламенце па пагадненні аб умовах «Брэксіту» на канец лютага, паведаміла газета The Daily Telegraph.

Па даных выдання, галоўны партыйны парламенцкі арганізатар Джуліян Сміт, які прадстаўляе кіруючую Кансерватыўную партыю, даў зразумець, што намечанае на 14 лютага галасаванне ў Палаце абшчын не адбудзецца, таму што кіраўнік брытанскага ўрада не паспее дабіцца перагляду здзелкі па «Брэксіце». Цяпер вызначаецца новая дата ў канцы месяца, пачынаючы з 25 лютага. Сміт пры гэтым выказаў асцярогу, што спікер ніжняй палаты парламента Джон Беркау можа паспрабаваць падарваць планы ўрада і спрыяць правядзенню галасавання ў больш ранні тэрмін.

The Daily Telegraph раней інфармавала, што члены брытанскага ўрада таемна абмеркавалі план адтэрміноўкі даты «Брэксіту» на восем тыдняў — да 24 мая. Мэй жа лічыць недапушчальным перанос «Брэксіту» і абяцае, што выхад краіны з ЕС адбудзецца, як і было запланавана, 29 сакавіка.

### Японія мае намер упершыню прызнаць існаванне свайго карэннага народа

Кіруючая Ліберальна-дэмакратычная партыя Японіі падрыхтавала законапраект, які прызнае прадстаўнікоў племені айнаў у якасці карэннага насельніцтва краіны. Як піша газета Asahi, ён будзе разгледжаны ў рамках гэтай сесіі японскага парламента.

Племя айнаў пражывала на поўначы японскага архіпелага за некалькі стагоддзяў да з'яўлення продкаў сучасных японцаў. Айны гавораць на ўласнай мове, і іх лад жыцця моцна адрозніваецца ад японскага. Напрыклад, некаторыя прадстаўнікі племені працягваюць здабываць ежу паляваннем і пакланяюцца ўласным багам, якія не знаёмыя большасці японцаў.

З-за сваёй спецыфічнай сітуацыі ў японскім грамадстве айны на працягу гісторыі станавіліся аб'ектам прыгнёту. У сярэднявечную эпоху самурайскі ўрад рэгулярна адпраўляў баявыя атрады, якія нападалі на айнскія землі, а ў 1899 годзе ўлады Японіі прынялі афіцыйную пастанову, паводле якой адмаўлялася існаванне айнаў як асобнага народа. З-за яе многім айнам даводзілася хаваць сваё паходжанне, каб пазбегнуць дыскрымінацыі. Гэтая заканадаўчая норма была адменена толькі ў 1997-м.

### NASA назвала 2018 год чацвёртым самым гарачым у гісторыі



Мінулы год стаў адным з самых цёплых з калі-небудзь зарэгістраваных за ўсю 139-гадовую гісторыю метэаназіранняў. Пра гэта паведамілі ўчора вучоныя з Нацыянальнага ўпраўлення ЗША па даследаванні акіянаў і атмасферы (NOAA) і Нацыянальнага ўпраўлення ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (NASA).

Пры гэтым, па даных NOAA і NASA, 2018 год стаў чацвёртым сярод самых цёплых гадоў. Дзве ўрадавыя ўстановы ЗША выкарыстоўваюць розную метадыку разліку глабальных тэмператур, але абодва ведамствы сышліся ў меркаванні, што мінулы год працягнуў самы гарачы перыяд за ўсю гісторыю метэаназіранняў, які доўжыцца ўжо пяць гадоў.

«Уплыў глабальнага пацяплення ўжо адчуваецца: паводкі, спякота, інтэнсіўныя ападкі і змяненне экасістэм», — падкрэсліў кіраўнік Інстытута касмічных даследаванняў імя Годарда пры NASA Гэвін Шміт. «З 1880 года сярэдняя тэмпература на паверхні Зямлі ўзрасла прыкладна на адзін градус па Цэльсію, што выклікана актыўнасцю чалавека», — гаворыцца ў прэс-рэлізе.

Гэты даклад NASA супярэчыць пазіцыі амерыканскага прэзідэнта Дональда Трампа, які неадназоава выказваў сумненне ў тым, што змяненне клімату адбываецца з-за ўздзеяння чалавека.

**Извещение об отмене аукциона**

ООО «БелИнвестОценка» извещает об отмене открытого аукциона по продаже объектов Республиканского производственно-торгового унитарного предприятия «Управляющая компания холдинга «БЕЛОРУССКАЯ ЦЕМЕНТНАЯ КОМПАНИЯ», назначенного на 18.02.2019 г. Извещение об аукционе было опубликовано в газете «Звязда» № 9 от 16.01.2019 г.

УНП 191692351

Блізкая ўлада

# Улічыць інтарэсы ўсіх

**На гэтым тыдні прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях у сваіх рэгіёнах праводзілі старшыні Мінаблвыканкама і Гомельскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА і Уладзімір ДВОРНІК.**



Анатоль Ісачанка.

Кіраўнік прысталічнага рэгіёна прыняў 14 чалавек у Слуцку. Заяўнікі галоўным чынам звярталіся да губернатара з пытаннямі, што не вырашаюцца ў іх на працягу некалькіх гадоў. Так, жыхар Слуцка прасіў зменшыць яму арэндную плату за ўчастак, на якім ён вядзе рэканструкцыю будынка фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Старшыня Мінаблвыканкама папрасіў мясцовыя ўлады пайсці чалавеку насустрач, напрыклад, вынесці на Савет дэпутатаў прапанову аб зніжэнні кошту арэнды для гэтага чалавека і наогул тых, хто займаецца рэканструкцыяй будынкаў. У сваю чаргу, мясцовыя ўлады могуць абавязаць завяршыць будаўнічыя работы на працягу адпаведнага тэрміну.

З нагоды працаўладкавання звярнулася жыхарка Слуцка, якая 25 гадоў працавала сацыяльным работнікам. Затым яна перайшла на месца загадчыцы пракатнага пункта на гарадскім стадыёне. Па заканчэнні тэрміну дзеяння кантракта наймальнік не працягнуў з ёй працоўныя адносіны. Анатоль Ісачанка даручыў спецыялістам райвыканкама прапанаваць жанчыне варыянты працаўладкавання.

Дзве мясцовыя жыхаркі агучылі праблему з грамадскім транспартам: аўтобусам нельга перасякаць трасу Р-23 у месцах, дзе няма святлафораў, таму людзям даводзіцца ісці да прыпынку два кіламетры. Губернатар даручыў дэталёва вывучыць гэтае пытанне.

На прыёме грамадзян таксама падымаліся пытанні зямельных адносін, павелічэння хуткасці інтэрнэту, паляпшэння жыллёвых умоў, якасці медыцынскага абслугоўвання.

«Чалавек задаволены прыёмам толькі ў тым выпадку, калі яго пытанне вырашана. Аднак мы пры працы са зваротамі павінны ўлічваць інтарэсы і суседзяў, і іншых зацікаўленых людзей. Таму пытанні трэба разглядаць у комплексе, так, каб прынятае рашэнне было прымальным для ўсіх бакоў», — адзначыў Анатоль Ісачанка.



Тое, што прадстаўнікі улады ўсіх узроўняў павінны максімальна ўнікаць у сітуацыю кожнага, хто да іх звярнуўся, падкрэсліў і Уладзімір Дворнік.

На прыёме прысутнічалі таксама прадстаўнікі ведамстваў, знаёмыя з сітуацыяй альбо гатовыя даць ёй ацэнку ў адпаведнасці з заканадаўчай базай. Так разглядалася пытанне жыхаркі Ельска. З 2015 года жанчына спрабуе выправіць, па яе словах, парушаныя суседзямі нормы пры будаўніцтве гаража і агароджы на сумежным участку. Па даручэнні губернатара сітуацыя будзе вывучана з выездам на месца.

З ганаровай місіяй прыйшлі на прыём бацька і сын. Яны прапанавалі абмеркаваць перспектывы развіцця ўзаемаадносін з Варонежскай вобласцю напярэдадні святкавання 75-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па просьбе калег з Варонежа мужчыны перадалі Уладзіміру Дворніку медаль «За заслугі па ўвекавечанні памяці загінулых абаронцаў Айчыны». Узнагарода ўручана ў знак падзякі за беражлівае стаўленне і захаванне гістарычнай спадчыны, а таксама за падтрыманне ініцыятывы аб устанаўленні памятнага знака ў гонар ураджэнцаў Гомеля — братоў Лізюковых, што гераічна праявілі сябе ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Усяго ж на прыём старшыні аблвыканкама запісаліся восем жыхароў Гомельшчыны. Пытанні пяці з іх былі разгледжаны загадзя.

Напрыклад, сямейную пару з Гомельскага раёна хвалявала пытанне празрыстасці фарміравання спіса патэнцыйных навасёлаў у адзін са шматкватэрных дамоў, што цяпер будуецца. Адначасова яны агучылі і жаданне атрымаць жыллё ў гэтым будынку. Сужэнцаў запрасілі ў адміністрацыю раёна і дакументальна пацвердзілі абгрунтаванасць уключэння ў спіс на атрыманне кватэр кожнага прозвішча. Пытанне было знятае.

**Паводле БелТА.**

# ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ КАЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Марына Коўчур, мама Каці, сустракае нас каля дома ў вёсцы Самуэлева, Каця весела махае рукой праз акно. Стары барак — частка былой панскай сядзібы. Пакоі ў ім атрымаў муж Марыны ад мясцовага ААТ «Рапс», дзе ён працуе. Вось ужо некалькі гадоў сям'я, калі з'яўляюцца вольныя сродкі, робіць рамонт. Пакуль удалося замяніць пячное ацяпленне на паравое (дым з печы асядаў у лёгкіх, што для Каці супрацьпаказана), вокны і дзверы, а таксама абсталяваць душ і прыбіральню. Наперадзе яшчэ шмат работ, але асноўнае, на што ідзе ўвесь невялікі бюджэт сям'і, — аднаўленне Каці.

## Тры месяцы комы

Той дзень, 21 верасня 2015 года, Марына Коўчур памятае ва ўсіх яго жудасных падрабязнасцях.

— Каця з сябрамі вярталася са школы з суседняй вёскі Крупіца. Аўтобус спыніўся, выйшла пяць-шэсць чалавек — школьнікі і двое дарослых. Сталі пераходзіць дарогу. Дзяўчынка, якая ішла за руку з Кацяй, інтуітыўна зрабіла крок назад, які выратаваў ёй жыццё, а Каця не паспела... Было дзве гадзіны дня, я толькі прыйшла з працы. Прыбегла Кацiна сяброўка: «Цёця Марына, Кацю машына збіла». Мы з мужам паехалі туды. Каця ляжала на дарозе, кроў з носа, вушэй, у яе была дрэнная згусальнасць... А «хуткая» заблудзіла. У выніку прыехала іншая брыгада, на той момант Каця ўжо ўпала ў кому. Давезці яе змаглі толькі да найбліжэйшай бальніцы ў Мінску — хуткай дапамогі, хоць спачатку планавалі даставіць у Бараўляны.

З гэтага моманту на шляху трапляліся неабыякавыя людзі. Медыкі і кіроўца «хуткай» — адны з іх. Па дарозе ў Каці спынілася сэрца, але ўрачам удалося яго запусціць. Пакуль медыкі змагаліся за жыццё дзяўчынкі, кіроўца аб'язджаў спадарожныя машыны па абочынах і газонах — нягледзячы на сігналы, карэту «хуткай» не спяшаліся прапускаць, — а паралельна звязваўся з бальніцай хуткай дапамогі.

— Я чула, як ён прасіў прыняць нас і тлумачыў, што не давязе дзіця да Бараўлян. Я тады не паспела яму нічога сказаць, але і сёння вельмі ўдзячная гэтаму чалавеку за неабыякавасць, — кажа Марына Коўчур.

У бальніцы хуткай дапамогі Кацю чакалі чатыры брыгады медыкаў і неадкладныя аперацыі. Дзяўчынцы выдалілі правую нырку, у яе дыягнаставалі разрыў печані і моцнае ўнутранае кровазліццё, пералом асновы чэрапа, зрушэнне грудной клеткі, раздробленне сцягна. На працягу месяца дзяўчынка балансавала на мяжы, толькі калі стан больш-менш стабілізаваўся, з'явілася магчымасць перавезці яе ў профільную медыцынскую ўстанову — РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі. Але Каця па-ранейшаму была ў коме.

— Мяне толькі аднойчы пусцілі ў рэанімацыю. Нягледзячы на тое, што мая мама настройвала трымаць сябе ў руках, там я змагла прабыць не больш за хвіліну, — успамінае Марына. — Ці давалі прагнозы ўрачы? Аднойчы ў РНПЦ неўралогіі мне сказалі: «З такой траўмай, як у Каці, мужчына-спартсмен пражыве не больш за месяц, а ў вас пайшоў ужо другі...»

Потым былі дзіцячая абласная бальніца ў Бараўлянах, а затым — Беларускі дзіцячы хоспіс. Марына суткамі не адыходзіла ад ложка дачкі. У хоспісе яе навучылі абслугоўваць чалавека ў коме — ставіць катэтары, зонд, карміць праз яго, адпампоўваць макроту — Каця дыхала праз трубку ў горле.

Калі дзяўчынка знаходзілася ў хоспісе, абвастрылася яшчэ адна праблема — з раздробленай правай нагой. У нейкі момант нават паўстала пытанне яе ампутацыі. Марына не пагаджалася. І яе падтрымала дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса Ганна Гарчакова. Яна знайшла хірурга з РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, які рызыкнуў зрабіць Каці аперацыю. Андрэй Дземянцоў сабраў нагу літаральна па кавалачках.

— Дзякуючы Андрэю Барысавічу, які дагэтуль нам дапамагае, Каця пачала хадзіць, — кажа жанчына.

Толькі перад Новым годам, больш чым праз тры месяцы пасля здарэння, Кацю прывезлі дадому. І праз пару тыдняў здарыўся літаральна цуд — дзяўчынка выйшла з комы. Але яшчэ амаль год яна не ўставала з ложка. Марына магла адлучыцца ад дачкі толькі ў выключных выпадках — калі, напрыклад, патрабавалася яе прысутнасць на следчым эксперыменце.

## Крымінальная справа

Сухія радкі зводкі ДАІ сведчаць, што каля дзвюх гадзін дня 21 верасня 2015 года кіроўца рэйсавага аўтобуса МАЗ высадзіў дзяцей каля павароту на вёску Самуэлева, 9-гадовую дзяўчынку збіў сустрэчны красовер Honda C-RV.

Трэба адзначыць, што 66-гадовы кіроўца аўтамабіля пасля заняў своеасаблівую пазіцыю: вінавацію кіроўцу аўтобуса, дарослых аднасяльчан, якія выйшлі на прыпынку разам з дзецьмі, настаўнікаў і нават бацькоў дзяўчынкі. А сябе называў чалавекам, які выпадкова апынуўся не ў той час не ў тым месцы.



— Калі Каця знаходзілася ў коме ў хоспісе, мне патэлефанаваў следчы і паведаміў, што справа закрытая — няма саставу злачынства. Я толькі і здолела спытаць: «Як? Вы бачылі, у якім стане мая дачка?» — успамінае Марына.

У выніку траўмы прызналі цяжкімі, матэрыялы справы пачаў разглядаць Следчы камітэт. Падчас следчага эксперымента ўстановяць, што кіроўца «хонды» меў тэхнічную магчымасць бачыць дзяцей на ўзбочыне за 11,8 секунды, аднак не прыняў мер для зніжэння хуткасці, а на асфальце не знойдзена слядоў экстраннага тармажэння.

— Да апошняга ён судзіўся з намі, дайшоў да Вярхоўнага Суда, — кажа Марына. — Мы былі настолькі выматаныя, што не хацелі ніякіх кампенсацый, я не магла дачакацца, калі гэтую справу закрыюць.

У чэрвені 2016 года суд прыгаварыў кіроўцу да двух гадоў пазбаўлення волі і абавязаў выплаціць шкоду пацярпелай.

## Насуперак дыягназам

Марына і Віталь рабілі ўсё магчымае для таго, каб хоць крыху аблегчыць стан дачкі, якая хоць і прыйшла ў сябе, аднак па-ранейшаму не ўставала з ложка. Прайшлі некалькі курсаў рэабілітацыі ў бальніцы ў Аксакаўшчыне, у абласным дзіцячым цэнтры медыцынскай рэабілітацыі ў Пухавічах і ў Беларускім дзіцячым хоспісе, а паміж імі займаліся з дзяўчынкай дома.

— Пасля першага курса ў Пухавічах я ўбачыла вялікія вынікі: Каця навучылася самастойна поўзаць. А падчас трэцяга курса яна самастойна выйшла з кабінета ЛФК! З таго часу мы стараемся два разы на год пабываць там. Каці распрацоўваюць праграму рэабілітацыі і стараюцца дасягнуць поўнага выніку. Ці выязджалі за мяжу? Ні разу, бо, на мой погляд, у нас ёсць выдатныя спецыялісты, якія могуць паставіць на ногі, і нам з імі пашчасціла сустрэцца.

Пастаянную падтрымку сям'і аказвае і Беларускі дзіцячы хоспіс. Акрамя рэабілітацыі, Кацю запрашаюць на ўдзел у розных мерапрыемствах і паездках. Летась ёй падарылі, напрыклад, трохдзённую паездку ў Вільнюс.

Каця, дарэчы, камунікабельнасцю і гарэзлівасцю не адрозніваецца ад сваіх равеснікаў. Кантактуе з імі, між іншым, як у сацыяльных сетках, так і ўжывую. Вучыцца, праўда, яна вымушаная дома. І з гатоўнасцю дэманструе нам дзённік, дзе адзнак, ніжэйшых за сямёрку, няма. Раней дзяўчынка не магла пісаць, тэкст набірала на камп'ютары, а сёлета ўдалося вярнуць і гэты навык. З педагогам-дэфектолагам апошнім часам працуе над аднаўленнем мовы, магчыма, і яна з часам вернецца. Урачы ж, якія ведалі Кацю і не давалі спачатку ніякіх прагнозаў, толькі разводзяць рукамі — інакш як цудам гэта не назавеш.

У лістападзе мінулага года Каці зрабілі чарговую аперацыю, дзякуючы чаму зніклі пастаянныя праблемы з носам, а разам з імі і неабходнасць у назальных кроплях. Але наперадзе яшчэ некалькі хірургічных умяшанняў. З нагі трэба дастаць скобы, падчас пластычнай аперацыі на твары быў пашкоджаны нерв, які праз пару гадоў таксама давядзецца апераваць. Трэба прызнаць, што пакуль праблемы застаюцца: трэмар (дрыжэнне) рук і ног, а год таму з'явіліся сутаргі, з-за чаго дзяўчынка вымушаная пастаянна прымаць прэпараты. Магчыма, аднаўленне ішло б хутчэй, калі б у Каці быў трэнажор. Аднак вясковая сям'я жыве небагата, на адзіны заробак Віталя. Марына, якая да трагедыі працавала даяркай у ААТ «Рапс», ад працы пакуль не можа і марыць, а невялікая пенсія Каці адразу ідзе на набыццё неабходных лекаў на месяц.

Аднак Марына не акцэнтуе ўвагі на цяжкасцях, а дачку выхоўвае так, быццам бы і няма страшных дыягназаў і інваліднасці. Сям'я стараецца жыць сённяшнім днём і з аптымізмам глядзіць у будучыню. Напэўна, у гэтым і ёсць сакрэт таго, як, сутыкнуўшыся з самай цяжкай сітуацыяй, не адчаяцца, а знайсці ў сабе сілы яе пераадолець.

P. S. Калі вы хочаце нечым дапамагчы Каці Івановай, можна звязацца з яе маці Марынай па тэлефоне: 8 (029) 739-19-35.

**Алена КРАВЕЦ,**

*Мінскі раён.*

**Фота Андрэя САЗОНАВА.**




## ЦЕМНАТА — СЯБРОЎКА МОЛАДЗІ

Так было, так ёсць, так, мусіць, будзе: жанчынам болей трэба, яны больш цікаўныя за мужчын, хоць гэта ім не заўжды на карысць...

Некалі ў вёсках моладзі шмат было, кожны вечар нейкія зборы ў іх, кожную суботу — вечарынкі ў клубе. І добра каб хадзілі толькі хлопцы ды дзеўкі, а то ж і цёткі з бабулямі! Сыдуцца перад пачаткам, пазаймаюць лаўкі ўздоўж сцен і сядзяць сабе, ва ўсе вочы глядзяць ды языкамі плешчуць: у той дзеўкі спадніца закароткая, у той нос задоўгі, той хлопец не так пастрыжаны, а той не ўмее танцаваць... А ўжо калі ён каля дзяўчыны спыніўся ды размову пачаў, калі дадому яе праводзіў, — ледзь не ўслед папаўзуць... Мо нічога такога і не ўбачаць, але ж потым прыдумаюць і гэткіх плётак наплятуць, што не адмыешся!

Найбольшай «мастачкай» тут цётка Дуня была: у яе і не сеянае расло, бо ў маладосці, казалі, чаго не вырабляла! Пад старасць такія заўжды вельмі чэснымі робяцца...

Карацей, бяда ў маладых: асобныя з дзяўчат баяцца ў клуб прыходзіць.

Хлопцы сталі думаць, як жа паламаць гэтую завядзёнку, як адвучыць пляткарак да ранку на танцах сядзець?

Спачатку вырашылі па-людску зрабіць: аб'яўлялі танец спецыяльна для жанчын — польку альбо кракавяк. А пасля яго адразу ж ігралі марш: маўляў, пара вам, каханенькія-родныя, ідзіце дадому, заўтра ж да сонца ўставаць...

Не дапамагло: заморацца цёткі, пакуль танцуюць, засапуцца... І не — каб потым на вуліцу... Зноў на лаўкі пасядуць.

Ну, тады, як той казаў, не будзе Гіршы — будзе чорт іншы. З суседняй вёскі на вечарынкі часцяком прыходзілі хлопцы-забіякі. Іх толькі зачапі... Часам і платы трашчалі, і да крыві даходзіла...

У той раз бойку надумалі разыграць. Па сігнале: музыка сціхла, у калідоры нейкі вэрхал усчаўся.

— Вой, у каго ж гэта кулакі свярбяць? — падхапілася з лаўкі Дуня, ужо гатовая нос у дзверы ўткнуць.

Толькі падышла да іх, як раптам хліп і... хоць ты вока выкалі: святло прапала.

А бойка тым часам «укацілася» ў клуб.

Тут бы жанчынам некуды схавацца. А куды? Не дзеці ж — пад лаўкі не палезеш. Верашчаць яны... А хлопцам толькі гэтага і трэба: па голасе пазнавалі, дзе і каторая... Дуні, бедная, найбольш «уляцела». І раптам...

Як пачалася тая бойка, так і скончылася: усё сціхла, у клубе загарэлася святло і амаль нікога там — толькі жанчыны спужаныя.

...З таго вечара на танцах яны рэдка з'яўляліся. А калі і прыходзілі, да ранку не сядзелі, хлопцаў ды дзяўчат не абгаворвалі, плётак не плялі. Во як некалі было!

Як стала? Ці вам казаць? Ні моладзі ў асобных вёсках, ні вечарынак. На жаль.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## А ЗАСЦЕНАК ТАКІ ЗАСТАЎСЯ

Старая гэта гісторыя, але на маёй малой радзіме помняць яе і дагэтуль.

Вярсты за дзве ад нашай вёскі быў панскі маёнтак Міхаліна. Усяго і выгод там, што рэчка ды лес. А землі бедныя, сенажаці таксама... Былы гаспадар не змог выплачваць падаткі і ўсё прадаў «з малатка». А восць новы стаў трымаць кароў, каб угнойваць палі, сеяць лубін. На рэчцы пабудаваў вадзяны млын, адкрыў бровар: паводле кнігі «Памяць» Пастаўскага раёна, там выраблялася штогод 11 200 вядзёр спірту. Прадаваў ён і лес, і землі, у прыватнасці — аддалены кавалак, дзе стаялі гумны (па-нашаму — такі)...

З часам, пры новай уладзе, іх будынкі разабралі, на месцы таксоў шэсць сем'яў пабудавалі хаты. Атрымаўся ладны такі засценак. І з ранейшай назвай — Такі.

Жыхары яго працавалі на зямлі. Адзін да таго ж выпальваў вапну — і сабе, і на продаж, другі, інвалід, умеў рамантаваць абутак, яшчэ адзін вучыў па суседстве дзетак. А яго сын — гарманіст-самавук, іграў на вечарынках у клубе. Карацей, у засценак досыць часта збочвалі людзі — і свае, і чужыя.

Дык вось, аднойчы зімой у вазку і на добрым кані едзе нейкі незнаёмец, пытае ў першай сустрэчнай:

— Які гэта засценак?

— Такі, — адказвае дзяўчына.

— Які гэта такі? — не разумее мужчына.

— Такі.

— Вось я табе зараз пакажу, — схапіў пугу яздок, — як з людзьмі размаўляць!

— Дзядзечка, я ж праўду кажу: засценак — Такі! Я і сама з тых Такоў.

— З Такоў? — дацэміў нарэшце мужчына, але пуга ўжо ўзвілася над канём, і той панёс яго з усіх капытоў...

Цяпер у Таках хат няма: пасля таго, як арганізавалі калгас, людзям далёка стала за кіламетры хадзіць на работу. Вось яны і распрадалі свае будынкі, выехалі ў іншыя вёскі.

А ўрочышча Такі жыве. Дарэчы, у лесе каля яго шмат грыбоў і ягад.

**Леанарда Аляшэвіч,**
*г. Смаргонь.*

## ЦЯЖКА БЫЦЬ БАГАМОЛЬЦАМ

Мой айчым расточку быў невялікага. Яго нават у войска не бралі — у мірны час. А вось калі грымнула вайна, ужо спатрэбіўся, ахоўваў масты ў далёкай Сібіры. За семярых, расказваў, нагаладаўся, а ўжо намёрзся... На ўсё жыццё хапіла! Але ж галоўнае, што ацалеў, жывы дадому вярнуўся, з часам (тады любыя мужчыны ў цане былі) да мамы ў прымы прыйшоў. А вёсцы ж цікава, хто ён такі?

Першае, што людзі заўважылі — дужа набожны (у нас такіх амаль не было), а гэты, бач, ведае і святы, і прысвяткі, трымаецца посту, у нядзелі не працуе... (Ён і праўда з усіх свят толькі Радаўніцу не любіў: казаў, што гэта за дзень такі — зранку шчыруюць, у абед гаруюць, а вечарам песні пяюць.)

Карацей, Якімавіча ў вёсцы празвалі Багамольцам.

Другое, што заўважылі, скнара ён — яшчэ той: снегу зімой не выпрасіш. А ўжо каб выпіў за свае, дык, напэўна б, свет перавярнуўся! «Што — чужая ў ахвотку, а свая ў пякотку?» — падколвалі яго мужчыны.

Я гэта ведаў і неяк уплываць на айчыма, вядома ж, не збіраўся. Само па сабе атрымалася.

...У той год на Вялікдзень былі тры дні выхадныя, так што ў пятніцу пад вечар я ўжо быў дома. Мама хуценька сабрала на стол. Ну і я ж не з пустымі рукамі з горада ехаў: мая на стале гарэлка, значыць, я і наліваю?

Першаму, вядома ж, айчыму.

Ён сваю чарку рукою накрыў і кажа:

— Я піць не буду. Сёння пятніца, вялікі пост, грэх.

Гаворыць так, а вочкі, бачу, блішчаць-блішчаць...

— Ды не, — кажу, — гэта не грэх! За мой прыезд... За сустрэчу... Па адной, маленькай...

Якімавіч урэшце згадзіўся.

Перад другой чаркай зноў крыху паадпекваўся. А потым ужо і не, бо ўсё роўна ж аскароміўся...

Назаўтра я прачнуўся як нічога ніякага, а вось айчым, бедны, не: ён — бачу — сядзіць за сталом, аберуч трымаецца за скроні, кажа, што ў галаве нібы курант хто выбеў, і яны там пішчаць-пішчаць...

— Саграшыў, — хрысціцца, — даруй, мне, Божа! І ратуй!

— Тут, — кажу, — не Бог дапаможа, тут іншыя лекі трэба.

Наліваю чарку гарэлкі. Якімавіч трохі ўпіраецца, але ж, выпіўшы, прызнае:

— Глядзі ты, сціхлі мае куранты — мазгі больш не дастаюць...

Яму... А вось мне... Лёг я ўвечары спаць, а заснуць ніяк не магу: светла ў хаце, хоць ты іголкі збірай (не кажучы пра курант).

— Можа, святло выключым? — пытаю ў айчыма.

— Не, — той кажа, — сёння — грэх: усяночная служба ў цэрквах. Трэба, каб у хаце відно было.

Трэба дык трэба, я цярплю, ваpочаюся, але ж сон ніяк не бярэ. Пытаю:

— А вы ведаеце, колькі за электрычнасць прыйдзецца плаціць?

— Колькі? — уздрыгвае айчым.

— Ды рублёў з дзесяць, — кажу.

Сцішыўся той, падумаў, а ўрэшце сказаў:

— Ну то я выключу... Нашу лямпачку Бог не ўбачыць.

...Тут вось што можа цікава: ні я, ні мама з хаты нічога нікому не выносілі, не расказвалі, але ўся вёска чамусьці ведала, што Багамолец у вялікі пост выпіваў. І святло патушыў у святую ноч.

Вось так, сам таго не жадаючы, я падмачыў айчыму аўтарытэт.

**У. С.,**
*г. Крычаў.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

*Ад яе ж чарговы напамін, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца, — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены на пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае пад старшынствам* ***спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны****, і маленькае рэдакцыйнае на чале з* ***першым намеснікам галоўнага рэдактара спадарыняй Наталляй Карпенкай*** *— працуе, гісторыі пошта прыносіць... Так што пішыце!*

Неасабісты суб'ектыў



# ХАТА З КРАЮ

## Бойцеся перастрахоўшчыкаў, якія баяцца, самі не ведаючы чаго

У перапоўненым аўтобусе на месцы для інвалідаў і пасажыраў з дзецьмі ехала вельмі каларытная пара, абое на добрым падпітку. Дзяцюк, які, напэўна, нядаўна выйшаў з месцаў зняволення: пра гэта сведчылі татуіроўкі на ўсіх бачных частках цела, хіба што не на лбе, і напампаваныя вазелінам кулакі (хто «родам» з 90-х, ведае, што гэта такое). Паводзіў ён сябе падкрэслена добразычліва, але ў вачах чыталася: лепш не чапайце. Паненка ў яго была, што называецца, да пары: з надзьмутымі ботаксам вуснамі, пафарбаванымі ў чорны колер валасамі, накладнымі вейкамі. Але ўвесь гэты гламур губляўся за растрапанай прычоскай, юрлівым поглядам і парванымі на калене калготкамі. Дзеўка была п'яная, і па ўсім відаць было, што гэты стан для яе ўжо прывычны, а ботакс і вейкі — гэта з іншага, былога ўжо жыцця.

Я па натуры не ханжа і ўвогуле за свабоду нораваў, але тое, што дэманстратыўна тварылі гэтыя двое ў грамадскім транспарце, прымушала сарамлівa адводзіць убок вочы. Здавалася, яшчэ трохі — і ў твар паляцяць сарванае ад палкіх пачуццяў адзенне кагосьці з іх. Калі б гэта былі захопленыя адно адным падлеткі, яно б, можа, і глядзелася больш эстэтычна, чым слюнявыя п'яныя пацалункі прадстаўнікоў клуба «каму далёка за трыццаць», дый маладым людзям можна было б проста ласкава зрабіць заўвагу. Тут жа ўсе — а было нас на пярэдняй пляцоўцы чалавек дваццаць пяць, калі не больш, назіралі, бы аблітыя памыямі, і маўчалі. Зразумець кожнага з нас паасобку, пэўна, можна было: ніхто не хацеў нарвацца на «вазелінавыя» кулакі. Але ж як паскудна было на душы ад гэтай уласнай перастрахоўкі — ніякімі словамі вам не перадаць.

НАРЭШЦЕ адна бабуля, што сядзела насупраць «закаханых», не вытрымала: «Маладыя людзі, вы б ужо дадому даехалі, ці што?» Сказала не абурана, хутчэй жартам, з усмешкай. «Кавалер», які хвілін дзесяць назад гэтай самай бабулі з падкрэсленай ветлівасцю дапамагаў усаджвацца насупраць, вызверыўся: «Сядзі ціхенька, карга старая, калі хочаш жывой да сябе дадому даехаць!» Тут ужо не вытрываў малады мужчына, што стаяў побач, хоць жонка і тузала яго за рукаў. Ён нічога асаблівага не зрабіў, толькі паклаў хаму руку на плячо і ціха прапанаваў выйсці на наступным прыпынку. Той страпянуўся: пайшлі, выйдзем. Я таксама не прамінула падаца на выхад: па-першае, прыпынак быў мой, па-другое, цікава было, чым скончыцца спектакль тэатра нораваў, па-трэцяе (толькі па-трэцяе, прызнаюся шчыра), на экране смартфона ўжо трымала набраным «102», каб, калі што якое, не марудзячы, крычаць у трубку «ратуйце!».

Нічога падобнага рабіць не прыйшлося, бо, апынуўшыся на слізкім прыпынку, парачка пачала хапацца адно за аднаго, каб не паваліцца. Скасавурыўшыся на свайго працаўніка, які хоць і быў не вышэйшы і не мацнейшы за яго, але цвёрда стаяў на нагах і не выказваў ніякага намёку на страх, зэк зухавата схамянуў плячыма і паспяшаўся рэціравацца, цягнучы за сабой сваю абураную «даму»... Становучаму герою эпізоду таксама дасталося ад «палавіны» — увесь час, што ішлі да дома, яна яго пілавала: «Табе больш за ўсіх заўсёды трэба, атрымаеш калі-небудзь па галаве!» — «Ну не атрымаў жа! А што, глядзець на ўсё моўчкі, каб пасля самога сябе не паважаць», — супакойваў ён жонку...

Я гэты выпадак, сведкай якога днямі стала, прыгадала пасля ўчарашняй тэлефоннай размовы. Пазваніла ўвечары добрай знаёмай, мы калісьці жылі разам у інтэрнаце, яна скончыла ў свой час хімфак, паехала працаваць у вясковую школу, там і засталася. «Выбачай, няма часу доўга размаўляць, — кінула мне адрывіста ў адказ на прывітанне, — раблю конкурсную работу, макет хімічнай формулы клею». Высветлілася, што робіць яна гэта не ад сябе, а ад нейкага ўмоўнага Васі Пупкіна, вучня дзявятага класа, які будзе ўдзельнічаць у конкурсе ад іхняй школы. «А чаму гэта не робіць сам Вася?» (Лагічнае, пагадзіцеся, пытанне.) — «Ой, Вася ў мяне ледзь з чацвёркі на пяцёрку перабіваецца». — «А чаму тады менавіта яго на конкурс вязеш?» — «А таму што ў іх у класе чатыры чалавекі, усе хлопцы, і Вася самы ўдалы ў вучобе, ён у нас на ўсе алімпіяды ездзіць». — «А навошта тады везці гэтага троечніка Васю на конкурс? Няма ў класе паспяховага вучня, дый няма, школа ж у вас уся пяцьдзясят чалавек, на ўсе алімпіяды ды конкурсы не набярэшся...» — «Павінны ўдзельнічаць ва ўсіх, дырэктар так сказаў, інакш яго пазбавяць прэміі, а ён — нас. Таму і робім многае за вучняў самі». — «Дык гэта ж дурасць поўная і прафанацыя! Адмоўся, ды і ўсё. Ёсць жа аб'ектыўныя прычыны — далёка не ў кожным класе з чатырох чалавек будзе здатны да хіміі вучань!» — «А яно мне што, больш за ўсіх трэба? У такіх школах, як наша, многія настаўнікі так робяць. Нашто каму непрыемнасці?» — «А табе самой ад гэтага не гідка?» — «А я ўжо прывыкла»...

ШТО агульнага ў гэтых дзвюх гісторыях, спытаеце? Пакуль будзем маўчаць, бачачы хамства, пакуль будзем пакорліва выконваць дурнэнні, ведаючы, што з аб'ектыўных прычын у нашым выпадку іх выканаць якасна нельга, што атрымаецца не на карысць справы, а наадварот, але пры гэтым не асмельваючыся пра гэта сказаць, хамы будуць адучваць сябе гаспадарамі жыцця, а бюракраты весці рэй у многіх важных пачынаннях, зводзячы іх на нішто. Прынцып «абы чаго не выйшла», які моцна засеў у галовах, — вось што робіць нас такімі. А што можа «выйсці»? Чаму мы (прынамсі, большасць з нас) не дапускаем, што хаму пасля нашай заўвагі стане сорамна? Што чыноўнік аднаго асобна ўзятага раёна пасля таго, як вучань са школы не павязе склееных настаўнікам макет ці напісанае настаўнікам сачыненне, пераглядзіць патрабаванні да малакамплектных школ і не будзе іх мераць на адзін капыл з гарадскімі гімназіямі, дзе ў адным класе на паралелі вучняў больш, чым ва ўсёй школе?.. І давайце не будзем тут разважаць пра «лад», пра «сістэму». Яны што, перашкаджаюць нам быць прыстойнымі сумленнымі людзьмі? Найперш перад самімі сабой.

«Бойцеся людзей абыякавых», — перасцерагаў калісьці Юліус Фучык. Бойцеся і перастрахоўшчыкаў, якія баяцца, самі не ведаючы чаго, — дапоўнім яго, зыходзячы з сённяшніх нашых рэалій. Наступную фразу пісьменніка пра маўклівую згоду можна пакінуць без змянення.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ВЯЛІКАЕ РАДЫЁ МАЛОЙ РАДЗІМЫ!

**97,4 FM — Мінск, Лагойск, Смалявічы, Жодзіна.**
**102,4 FM — Мядзел, 102,6 FM — Крупкі, 104,2 FM — Барысаў.**
**104,8 FM — Капыль, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк, Баранавічы.**
**105,3 FM — Салігорск, Слуцк, Любань.**
**105,5 FM — Беразіно, Чэрвень, 105,6 FM — Старыя Дарогі.**
**107,4 FM — Маладзечна, Вілейка, Валожын.**

З вялікай радасцю паведамляю ўсім, хто яшчэ не слухае радыё «Мінская хваля», што ў нас з'явілася новая музычная ўпакоўка. Адбіўкі, джынглы, лайнеры, прома-ролікі, свіперы, бамперы, брыджы і ўсё, што надае радыёстанцыі індывідуальнасць. І напісалі — стварылі нам усю гэтую музычную прыгажосць Леанід Шырын і Lexa The DJ! Скажу я вам, што ўвайшла гэтая музычная вязь у наш эфір вельмі арганічна, усё пазнавальна і строга, так што мы зараз як фота ў прыгожай рамачцы. І яшчэ пра Леаніда Шырына: ён наогул сябар і талісман нашага радыё. Усе нашы вялікія праекты мы робім на яго музыку: гэта і «Сімвалы Беларусі» фотамастака Ірэны Гудзіеўскай, дзе гучаць яго мелодыі і нашы казкі, і які ўжо выйшаў на міжнародны ўзровень; і літаратурна-музычная кампазіцыя «Памяці ахвяр Мінскага гета» — гэты наш праект, дарэчы, перамог у адной з намінацый у рэспубліканскім конкурсе; і радыёспектакль «Са мной больш строга» ідзе на яго музыцы, і наш фестываль-конкурс «Просты матыў» прайшоў з яго непасрэдным удзелам у якасці члена журы — і гэты праект перамог у конкурсе, аб'яўленым Мінскім аблвыканкамам. І таму вялікі дзякуй кампазітару не толькі за песні, якія гучаць у нашым эфіры, але і за такую пастаянную музычную падтрымку!

Навін у нас шмат: з'явіліся ў ранішнім эфіры новыя рубрыкі: «Дзелавая кухня з Ксеніяй Куніцкай», «Хай-тэк» і «Гэта здорава» Софіі Ермаловіч, «Хто куды» і «Кулінарная карта» Юрыя Курпаціна, «Музычная гісторыя» і «Народныя прыкметы» Кірыла Таргонскага. І зусім выдатныя прыклады з гісторыі і сучаснасці роднай Мінскай вобласці ад Генадзя Пшэнніка: «100 фактаў аб Міншчыне», «Наша прапіска», «Сусвет малой Радзімы», гэта проста трэба слухаць, каб дакладна разумець, чым мы можам ганарыцца. Таму што «Мінская хваля» — вялікае радыё малой радзімы з унікальнымі навінамі і інфармацыяй і з ранішнім-дзённым-вячэрнім ток-шоу!

Але яшчэ мы і добрае радыё для добрых людзей, і ў нас не штарміць, і таму па-ранейшаму ў нас у гасцях практычна кожны дзень медыйныя персоны, якія расказваюць пра свае маючыя адбыцца канцэрты; пра прэм'еры песень і кліпаў; пра новыя альбомы; пра кнігі і вершы; пра карціны і выстаўкі; пра здароўе і новыя падыходы ў прафілактыцы хвароб; спартсмены — зразумела пра што; жыва гучаць праграмы пра валанцёраў, дабрачыннасць і высокае мецэнацтва; пра спектаклі і народную творчасць, бізнес і эканоміку. Гэта значыць, пра кожны дзень нашага беларускага жыцця. Прамыя эфіры ідуць з відэа, і гэтыя запісы заўсёды потым можна паглядзець на «Ютубе», а ў перспектыве — і на тэлевізійных экранах, ідуць перагаворы з адной з рэгіянальных тэлекампаній.

Цесна і шчыльна супрацоўнічаем з МУС, МНС, ДАІ — ад іх залежыць наша з вамі бяспека, таму гэта важна, пры гэтым праводзім конкурсы і віктарыны з вельмі добрымі прызамі. Дарэчы, пра прызы: іх у нашым эфіры таксама разыгрываецца дастаткова, і вы заўсёды можаце разлічваць на тое, што бясплатна па нашым білеце пойдзеце ў тэатр, дэльфінарый або на нашумелую выстаўку. Мы па-ранейшаму актыўныя ўдзельнікі міжнароднага конкурсу «Белазаўскі акорд», і сёлета ўсе фіналісты атрымалі ад нас падарункі, а пераможцы інтэрнэт-галасавання на нашым сайце — правы ратацыі ў эфіры.

Радыё «Мінская хваля» таксама прапануе поўны спектр рэкламных магчымасцяў па прасоўванні тавараў і паслуг у сваім эфіры. Мы самастойна рэалізуем рэкламныя праекты, з'яўляючыся ўнікальнай камерцыйнай прапановай з высокім узроўнем даверу да рэкламы сярод слухачоў і высокай ратацыяй аўдыторыі ў найбуйнейшых гарадах сталічнага рэгіёна, што самым станоўчым чынам адбіваецца на камерцыйных выніках. Пра гэта — начальнік рэкламна-прамоўтарскага аддзела Наталля Ярмоленка: «У нас гнуткая сістэма скідак. Працуючы па прынцыпе індывідуальнага падыходу, мы ў літаральным сэнсе зацікаўлены ў прасоўванні тавараў і паслуг нашых рэкламадаўцаў. Бо чым больш прыгожай рэкламы аб якаснай прадукцыі, якая выраблена і рэалізуецца прадпрыемствамі-вытворцамі Мінскай вобласці, пачуюць жыхары сталічнага рэгіёна, тым багацейшымі і больш паспяховымі станем і мы, як рэкламадаўцы. Галоўнае — верыць у тое, што робіш. А мы ж, маючы магчымасць наведваць прадпрыемствы, бачым не толькі канчатковы прадукт, але і ўсе этапы вытворчасці і асабіста пераконваемся ў якасці тавараў, выраблених у сталічным рэгіёне».

І пра асабістае. Барысаўская друкарня «1 Мая» надрукавала ў сціслыя тэрміны і маю кніжачку прозы «Радасці і гадасці дарослага жыцця» з вокладкай ад Наталлі Тараскінай і прадмовай ад Святланы Бароўскай. Проста пашанцавала...

**Тамара ВЯЦКАЯ,**
**дырэктар.**

*Рэкламна-прамоўтарскі аддзел радыё «Мінская хваля»*
*+375 (17) 228 13 44; +375 (29) 365 50 21*
*reklamamv@mail.ru; reklama@mvolna.by*
*mvradio.by*
УНП 690262864

# ГОСЦІ СТУДЫІ — 2018



**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 28 февраля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 60 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Примечание:** в соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| **Местонахождение лотов №№ 2–4:** Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 46 | | | | |
| **2** | Автомобиль МАЗ 6303 А5 СМБ-372- 20, рег. № АЕ 0719-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой автобетоносмеситель | **6 480,00** | 324,00 | 648,00 |
| **3** | Трактор ДТ-75 ДЕРС 2 с бульдозерным оборудованием, рег. № ЕА-3 9536, зав. № 739311, г. в. 2007 | **3 240,00** | 162,00 | 324,00 |
| **4** | Кран козловой ткк-5 (инв. № 1-132а) | **6 440,00** | 322,00 | 644,00 |
| **5** | Одноквартирный дом «лесника» (инв. №1-27). **Местонахождение:** Гомельская область, Ветковский р-н, г. Светиловичи | **960,00** | 48,00 | 96,00 |
| **6** | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16614**, общей площадью **472,3 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003856** общей площадью **0,2299 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 участок № 5. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания подъездной автомобильной дороги (земельный участок для размещения объектов улично-дорожной сети общего пользования). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003853** общей площадью **0,2216 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 участок № 2. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания административного здания с подъездной дорогой (земельный участок для размещения объектов административного назначения). **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 6 опубликован в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777)** | **116 618,80** | 5 830,94 | 11 661,88 |
| **Местонахождение лотов №№ 7, 9–12:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | | |
| **7** | Котельная установка со вспомогательным оборудованием, 2010 г. в. (инв. № 953) | **334,40** | 16,72 | 33,44 |
| **9** | Рама лесопильная вертикальная одноэтажная Р63-4Б, 2009 г. в. (инв. № 905) | **6 208,00** | 310,40 | 620,80 |
| **10** | Станок вертикально-фрезерный ВФ-87. 1989 г. в. (инв. № 054) | **4 243,60** | 212,18 | 424,36 |
| **11** | Станок продольно-фрезерный четырехсторонний мод. ВШ-160М-5СУ, зав. № 05005, 2005 г. в. (инв. № 844) | **8 883,20** | 444,16 | 888,32 |
| **12** | Станция компрессорная стационарная электрическая винтовая ММЗ-03- СВЭ5,6/0.7, 2009 г. в. (инв. № 903) | **2 400,00** | 120,00 | 240,00 |
| **13** | **Капитальное строение с инв. № 322/С-17095**, общей площадью **62,4 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **одноэтажное кирпичное здание весовой. Капитальное строение с инв. № 322/С-13278**, общей площадью **530,1 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажный кирпичный навес под стоянку автомобилей. Капитальное строение с инв. № 322/С-17094**, общей площадью **44,8 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание гаража для легковых автомобилей. Капитальное строение с инв. № 322/С-13275**, общей площадью **1 621,5 кв. м,** назначение – одноэтажное панельное здание материального склада, наименование – **одноэтажное панельное здание материального склада. Капитальное строение с инв. № 322/С-13272**, общей площадью **776,3 кв. м,** назначение – одноэтажное кирпичное здание мехмастерских, наименование – **одноэтажное кирпичное здание мехмастерских. Капитальное строение с инв. № 322/С-13276**, общей площадью **144,4 кв. м,** назначение – одноэтажное блочно-кирпичное здание склада, наименование – **одноэтажное блочно-кирпичное здание склада. Капитальное строение с инв. № 322/С-13274**, общей площадью **267,8 кв. м,** назначение – одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающей мастерской, наименование – **одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающей мастерской. Капитальное строение с инв. № 322/С-13273**, общей площадью **249,4 кв. м,** назначение – одноэтажное панельно-кирпичное здание деревообрезной мастерской, наименование – **одноэтажное панельно-кирпичное здание деревообрезной мастерской. Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002094,** общей площадью **1,9669 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28. Ворота металлические (инв. № 44/373) | **162 927,60** | 8 146,38 | 16 292,76 |
| **14** | **Капитальное строение с инв. № 322/D-14888**, общей площадью **152,4 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **механические мастерские**. **Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, 28Б /2-1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002091,** общей площадью **0,0258 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28 | **6 920,00** | 346,00 | 692,00 |
| **15** | **Капитальное строение с инв. № 322/D-14558**, общей площадью **45,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **гараж**. **Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, 28Б /2-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002091,** общей площадью **0,0258 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28 | **2 080,00** | 104,00 | 208,00 |
| **16** | **Капитальное строение с инв. № 322/С-13270**, общей площадью **1 229,3 кв. м,** назначение – двухэтажное кирпичное здание по ремонту автотранспорта (мехмастерские), наименование – **двухэтажное кирпичное здание по ремонту автотранспорта (мехмастерские). Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **32475010003002090,** общей площадью **0,3696 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28. Сетка металлическая (инв. № 44/372). Бетонное покрытие производственной площадки (инв. № 44/322г) | **76 240,00** | 3 812,00 | 7 624,00 |
| **17** | **Капитальное строение с инв. № 322/С-13279**, общей площадью **783,6 кв. м,** назначение – двухэтажное кирпичное сооружение растворо-бетонного узла, наименование – **двухэтажное кирпичное сооружение растворо-бетонного узла. Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100001004158,** общей площадью **1,1910 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей. Ограждение из ж/б плит базы ул. Кирова, 28 (инв. № 44/371) | **49 688,00** | 2 484,40 | 4 968,80 |
| **18** | **Капитальное строение с инв. № 322/D-14890**, общей площадью **74,0 кв. м,** назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **проходной пункт. Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28Б/1-1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002101,** общей площадью **0,0191 га (право аренды, доля в праве 4/5 ). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28Б | **5 880,00** | 294,00 | 588,00 |
| **24** | Трактор ДТ-75 ДЕРС 2 с бульдозерным оборудованием, рег. № ЕА-3 7299, зав. № 737634, г. в. 2007. **Местонахождение:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Крылова, 4 | **3 240,00** | 162,00 | 324,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 27–30:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | | | | |
| **27** | Автомобиль ГАЗ53 ВМШ 3.6 КО 503Б, рег. № АЕ 6949-3, г. в. 1987, цвет – голубой, тип ТС – грузовой специальный цистерна | **1 760,00** | 88,00 | 176,00 |
| **28** | Автомобиль МАЗ 543205-220, рег. № АА 6137-3, г. в. 2006, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **4 120,00** | 206,00 | 412,00 |
| **29** | Грузовой автомобиль МАЗ 543205-220, рег. № АА 6142-3, г. в. 2006, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **4 120,00** | 206,00 | 412,00 |
| **30** | Грузовой автомобиль МАЗ 6422 А8 330, рег. № АЕ 0559-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **4 960,00** | 248,00 | 496,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 31–34:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Крылова, 4 | | | | |
| **31** | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АВ 6516- 3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **3 640,00** | 182,00 | 364,00 |
| **32** | Автомобиль МАЗ 5432 А3-322, рег. № АЕ 0147-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **3 640,00** | 182,00 | 364,00 |
| **33** | Автомобиль МАЗ 543302 220, рег. № АВ 2697-3, г. в. 2007, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **3 640,00** | 182,00 | 364,00 |
| **34** | Автомобиль МАЗ 5551 А2 -320, рег. № АЕ 0146-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой самосвал | **3 840,00** | 192,00 | 384,00 |
| **36** | Мобильный автоматизированный растворобетонный узел БМУЛГФ. 0001 15М инв. № 2328. **Местонахождение:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **9 760,00** | 488,00 | 976,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 40, 41, 43, 46, 48:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Крылова, 4 | | | | |
| **40** | Автобус ПАЗ 3205 40, рег. № АI 6145-3, г. в. 2005, цвет – белый, тип ТС – автобус-вагон | **1 560,00** | 78,00 | 156,00 |
| **41** | Автобус ГАЗ 32213, рег. № АЕ 0557-3, г. в. 2008, цвет – бордовый, тип ТС – автобус-вагон | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| **43** | Автомобиль МАЗ 5336 А3 320, рег. № АI 2307-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой | **6 040,00** | 302,00 | 604,00 |
| **46** | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АI 0608-3, г. в. 2007, цвет – темно-синий, тип ТС – автобус-вагон | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| **48** | Автомобиль МАЗ 93802 0012, рег. № А 2211 А-3, г. в. 2007, цвет – серый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **1 960,00** | 98,00 | 196,00 |
| **49** | Автомобиль МАЗ 938660 044,рег. № А 3205 А-3, г. в. 2008, цвет – серый, тип ТС – полуприцеп бортовой. **Местонахождение:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **2 680,00** | 134,00 | 268,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 50–53:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Крылова, 4 | | | | |
| **50** | Автомобиль МАЗ 938662, рег. № А 2350 А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **2 800,00** | 140,00 | 280,00 |
| **51** | Автомобиль МАЗ 938662 042, рег. № А 3810 А-3, г. в. 2009, цвет – темно-серый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **3 320,00** | 166,00 | 332,00 |
| **52** | Автомобиль МАЗ 938662 041, рег. № 0485АА-3, г. в.2006, цвет – серый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **2 440,00** | 122,00 | 244,00 |
| **53** | Автомобиль МАЗ 938662 041, рег. № 0474 АА-3, г. в. 2006, цвет – серый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **2 440,00** | 122,00 | 244,00 |
| **55** | **Капитальное строение с инв. № 311/С-30617**, общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **хозфекальная канализация. Капитальное строение с инв. № 311/С-30619**, общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопровод. Капитальное строение с инв. № 311/С-181**, общей площадью **58,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **КПП. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Капитальное строение с инв. № 311/D-8627**, общей площадью **1 226,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **помещение здания конторы. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-1. **Капитальное строение с инв. № 311/D-9721**, общей площадью **2 087,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **производственный корпус № 2254. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002034,** общей площадью **0,8513 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания конторы и производственного корпуса инв. № 2254, здания КПП | **269 912,00** | 13 495,60 | 26 991,20 |
| **56** | **Капитальное строение с инв. № 311/С-179**, общей площадью **22,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Капитальное строение с инв. № 311/С-47026**, общей площадью **394,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад № 2246. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002036,** общей площадью **2,3788 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4/3. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания склада и здания склада инв. № 2246. Инженерные сети – линия электропередачи ВЛ-0,4 кВ (инв. № 22575). Недвижимые улучшения – забор железобетонный (инв. № 1833), (составные части: забор ж/б, ворота 2 ед.). Недвижимое улучшение – ограждения (инв. № 2253) | **19 680,00** | 984,00 | 1 968,00 |
| **57** | **Капитальное строение с инв. № 311/С-180**, общей площадью **940,0 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002049** общей площадью **0,2316 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4/3. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания гаража | **65 600,00** | 3 280,00 | 6 560,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 58–59:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Крылова, 4 | | | | |
| **58** | Кран-балка опорная электрическая г/п 5 т (инв. № 34) | **960,00** | 48,00 | 96,00 |
| **59** | Сварочный агрегат АДД 4004 (инв. № 1-629), зав. № 1921, 06.1987 г. в. | **1 360,00** | 68,00 | 136,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве: Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию: Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости: Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 февраля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 26 февраля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Займіцеся духоўным развіццём і самаадукацыяй. Зараз вам можа адкрыцца нешта новае і важнае пра сябе і пра мэты, якія вы перад сабой ставіце. У пятніцу можа адбыцца сустрэча са старымі сябрамі. Нядрэнна было б зрабіць ім якія-небудзь прыемныя падарункі. Скорыце ўсіх сваім талентам апавядальніка, будзеце вызначацца красамоўствам, лёгка і даходліва выказваць свае думкі.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні пажадана заняцца рашэннем бягучых праблем. Не давайце волю беспадстаўным сумневам. Вам цяпер катэгарычна проціпаказаны фанатызм у любых жыццёвых аспектах. Ведайце меру: нястрымнае імкненне да мэты, якой бы яна ні была, нічога добрага не абяцае. У сераду можа спатрэбіцца парада кампетэнтнага чалавека. Пятніца — удалы дзень для дзелавых сустрэч і вядзення няпростых перамоў.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вам цалкам па сілах ствáрыць вакол сябе гарманічную абстаноўку і дарыць навакольным людзям цяпло і радасць. Раскажыце блізкім пра свае планы, тым самым вы зробіце яшчэ адзін крок да іх рэалізацыі. У чацвер стануць зразумелымі перспектывы на найбліжэйшую будучыню. Напярэдадні шматабяцальныя прапановы, але поспех не прыплыве ў рукі сам, вы павінны праявіць актыўнасць.



**РАК.** Усе вашы праекты на гэтым тыдні стануцца паспяховымі. Нядрэнны час для таго, каб падняцца па кар'ернай лесвіцы. Упэўненасць у сваіх сілах дазволіць дасягнуць жаданага. У чацвер будзьце мэтанакіраванымі і не мяняйце свае планы. На гэты дзень пажадана не прызначаць сур'ёзных дзелавых сустрэч. У выхадныя адпачніце ад клопатаў і праблем.



**ЛЕЎ.** У першую палову тыдня лепш не пачынаць нічога новага, завяршайце неадкладныя справы і выпраўляйце памылкі, якія могуць раптам выявіцца. Паспрабуйце не заблудзіцца ў сваіх фантазіях, своечасова суадносьце іх з рэальнасцю, тады вашым планам нічога не пагражае. У выхадныя не забывайце пра блізкіх людзей, ім неабходныя ваша ўвага і дапамога.



**ДЗЕВА.** У панядзелак не спакушайцеся лёгкім заробкам, гэтым можна толькі ствáрыць хаос на сваёй асноўнай рабоце. У аўторак з'явіцца шанц бліснуць сваімі талентамі, не выпускайце спрыяльны момант. Зараз лепш дзейнічаць старымі выпрабаванымі метадамі, прасоўваца да жаданай мэты крок за крокам. Выхадныя добра было б прысвяціць вырашэнню хатніх праблем.



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні ваша душа будзе патрабаваць рамантыкі, у той час як зоркі настойліва рэкамендуюць праявіць як мага большую практычнасць ва ўсіх галінах. Лёс можа даць шанц вырашыць шматлікія праблемы. Вам зусім не перашкодзіць пачуццё меры, у тым ліку ў рабоце. У любых справах шукайце для сябе карысць, альтруізм не прынясе толку ні вам, ні таму, для каго будзеце старацца. Але і вам давядзецца разлічваць толькі на свае сілы.



**СКАРПІЁН.** Можаце дасягнуць любой мэты, галоўнае — зразумець, што менавіта вам патрэбна. На гэтым тыдні давядзецца прымаць важныя рашэнні і пажынаць іх плады. Супрацоўніцтва з партнёрамі з іншых гарадоў паступова наладжваецца, магчымая паездка, сустрэча і важныя дамоўленасці. У сераду запаветнае жаданне споўніцца, толькі не перашкаджайце лёсу. У пятніцу будзьце асабліва ўважлівыя да дзяцей і родных, стрымлівайце прыступы раздражняльнасці. У нядзелю дазвольце сабе маленькія радасці.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы параўнальна лёгка вырашыце ўсе пытанні, адкладзеныя ў доўгую скрыню. Прыйшоў час паказаць, чаму вас навучыла жыццё. Аднак будзьце асцярожныя, не паддавайцеся спакусе падвергнуць жорсткай крытыцы ўсё і ўсіх. Асаблівая шкода будзе нападаць на калег па рабоце. Лепш шукайце іншыя падыходы. У другой палове тыдня магчымы новы паспяховы рывок да вызначанай мэты.



**КАЗЯРОГ.** Аснова вашай паспяховасці на гэтым тыдні — гэта правільнае выкарыстанне сяброўскіх і родных сувязяў, гарманічныя адносіны з навакольнымі і добра наладжаныя каналы інфармацыі. Бадзёрасць духу і яснасць думак стануць вашымі відавочнымі перавагамі. Чацвер — спрыяльны дзень для ўладкавання на новую работу. Рух наперад і кар'ерны рост вам будуць забяспечаны.



**ВАДАЛІЎ.** Надыходзіць даволі ўдалы ў эмацыянальным плане тыдзень. Вы настроены пазітыўна. У панядзелак сцеражыцеся чужых парад, не выключана, што іх будуць даваць скрытыя нядобразычліўцы. У сераду будзеце як ніколі лёгкія на ўздым, але лепш большую частку часу прысвяціць найбліжэйшым неадкладных спраў. У пятніцу падумайце, што б вы хацелі змяніць, у найбліжэйшай будучыні з'явіцца такая магчымасць.



**РЫБЫ.** Прыслухайцеся да сябе, і зразумееце, як дзейнічаць у складанай сітуацыі, важна толькі не сякчы з-за пляча. Аўторак парадуе добрымі навінамі. Калі ў пятніцу паступіць цікавая прапанова, не адмаўляйцеся, бо ад гэтага, магчыма, будзе залежаць ваша кар'ера ў найбліжэйшай будучыні. Вашы ідэі прыцягнуць да вас новых шчырых сяброў.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.44 | 18.04 | 9.20 |
| Віцебск — | 8.38 | 17.50 | 9.12 |
| Магілёў — | 8.34 | 17.54 | 9.20 |
| Гомель — | 8.26 | 17.55 | 9.29 |
| Гродна — | 8.59 | 18.20 | 9.21 |
| Брэст — | 8.54 | 18.25 | 9.31 |

## Месяц

*Маладзік 5 лютага.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

**Пр.** *Марыі, Антона, Аркадзя, Івана, Іосіфа, Пятра, Сямёна, Фёдара.*
**К.** *Геранімa, Пятра, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 8 ЛЮТАГА




**1810** год — нарадзіўся (мястэчка Ула, цяпер у Бешанковіцкім раёне) Іван Фаміч Хруцкі, беларускі жывапісец, акадэмік жывапісу. Скончыў факультэт вольных мастацтваў Полацкага езуіцкага калегіума, Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Расіі і Літвы. Яго работы захоўваюцца ў Траццякоўскай галерэі, Рускім музеі, Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Памёр у 1885 годзе.

**1904** год — нарадзіўся (вёска Жданоўка, цяпер у Шумілінскім раёне) Аркадзь Іванавіч Лапо, беларускі вучоны-раслінавод, селекцыянер, акадэмік НАН Беларусі, акадэмік Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі. Аўтар больш як 80 навуковых прац, у тым ліку дзвюх манаграфій. Працы прысвечаны біялогіі каноплі і агратэхніцы насеннаводства збожжавых культур і лёну. Памёр у 1983 годзе.

**1914** год — нарадзіўся (горад Баранавічы) Валянцін Таўлай, беларускі паэт, дзеяч рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. З 1932 года на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў. У 1934 годзе арыштаваны, асуджаны на восем гадоў турмы. З 1939 года — у раённым перыядычным друку на Гродзеншчыне. Удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1947 гадах працаваў у Літаратурным музеі Я. Купалы. Аўтар зборнікаў вершаў, паэм, літаратурна-крытычных артыкулаў пра творчасць Я. Купалы, Я. Брыля, П. Пестрака і іншых. Памёр у 1947 годзе.

**1929** год — нарадзіўся (вёска Магільна Уздзенскага раёна) Леанід Міхайлавіч Лыч, беларускі вучоны-гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар. Аўтар даследаванняў па сацыяльна-класавых адносінах у Беларусі савецкага перыяду, гісторыі беларускай культуры, міжнацыянальных адносінах у Беларусі ў ХХ стагоддзі.




**1834** год — нарадзіўся Дзмітрый Іванавіч Мендзялееў, рускі хімік, член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук, прафесар Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1869 годзе адкрыў адзін з асноўных законаў прыродазнаўства — закон перыядычнай залежнасці ўласцівасцяў хімічных элементаў ад іх атамных мас. Аўтар больш як 500 друкаваных прац, сярод якіх класічная «Асновы хіміі» — першы стройны выклад неарганічнай хіміі. Яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах Беларусі. Памёр у 1907 годзе.

**1919** год — падпісаны дэкрэт СНК «Аб уводзенні вылічэння часу ў РСФСР па міжнароднай сістэме гадзінных паясоў». Савецкая Расія перайшла на грыгарыянскі каляндар.

**1945** год — пачалася Ніжнесілезская наступальная аперацыя войскаў 1-га Украінскага фронту супраць нямецка-фашысцкай групоўкі. Войскам Маршала Савецкага Саюза І. С. Конева была пастаўлена задача: разграміць праціўніка, выйсці да ракі Нейсе і ў перадгор'і Судэтаў, і такім чынам ствáрыць спрыяльныя ўмовы для разгрому немцаў у Верхняй Сілезіі і наступнага ўдзелу войскаў фронту ў наступленні на Берлін.



**1949** год — нарадзілася Ірына Мураўёва, расійская і савецкая актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расійскай Федэрацыі. Здымалася ў фільмах «Масква слязам не верыць», «Карнавал», «Самая абаяльная і прывабная» і многіх іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

## УСМІХНЕМСЯ

— Апішыце сябе трыма словамі.
— Разумны, актыўны, цямлівы, уважлівы.

**У мяне ў жыцці зараз вельмі цяжкі перыяд — раніца.**

Бацька пытаецца ў Вовачкі:
— Сынок, ці навошта ўсяму класу расказаў, што матэматыца з фізруком цалаваліся?
— Яна мяне сама пра гэта папрасіла.
— Як сама?
— Яна сказала мне: «Вовачка, ты ўвесь час смяешся на задняй парце! Раскажы ўсім, мы таксама пасмяёмся!»

**Як называецца такая самаацэнка, калі ты сам сабе ўжо не падабаешся, але пакуль усё яшчэ лепшы за ўсіх астатніх?**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.


Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.


http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by


Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.


Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 590.
Нумар падпісаны ў 19.30 7 лютага 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

8 лютага 2019 г. № 6 (491)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЭКАНОМІЯ ЦІ БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ?

## У паспяховай сацыялізацыі навучэнцаў ёсць абавязковыя складнікі

**АПТЫМІЗАЦЫЯ школ — працэс, які вельмі балюча ўспрымаецца сельскімі жыхарамі. Многія лічаць, што без школы ў населенага пункта няма будучыні, і маладыя сем'і тут не затрымаюцца. І хоць асноўная хваля закрыцця малакамплектных школ ужо прайшла, кожны год сетка ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі скарачаецца яшчэ на некалькі дзясяткаў. Так, у 2018 годзе па рашэнні мясцовых органаў улады былі закрытыя 25 і рэарганізаваныя 49 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Як правіла, агульнаадукацыйныя сярэднія школы рэарганізуюцца ў базавыя, базавыя — у пачатковыя, а дашкольныя ўстановы ўключаюцца ў педагагічны комплекс «дзіцячы сад — школа».**

### На дарогу — не больш як 30 хвілін

— Кожны навучэнец, незалежна ад таго, у якой школе ён вучыцца (гарадской ці вясковай, вялікай ці маленькай), мае права на атрыманне якаснай агульнай сярэдняй адукацыі, — падкрэслівае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.** — Таму, калі мясцовыя ўлады прымаюць рашэнне аб немэтазгоднасці захавання ўстановы адукацыі ў канкрэтным населеным пункце, яны павінны кіравацца не толькі эканамічнымі падлікамі. Працэс рэструктурызацыі заўсёды вымагае прадуманых і ўзважаных рашэнняў. Трэба ўважліва ўнікаць у кожную сітуацыю, а не гнацца за ўяўнай эканоміяй, трэба гутарыць з насельніцтвам, тлумачыць свае дзеянні і пераконваць.

У адпаведнасці з загадам міністра адукацыі, упраўленні адукацыі аблвыканкамаў і камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама да 1 снежня падаюць у Міністэрства адукацыі інфармацыю аб школах, якія ў наступным навучальным годзе плануецца закрыць або рэарганізаваць. Калі праводзіць работу пазней, будзе недастаткова часу для вырашэння ўсіх спрэчных пытанняў, правядзення тлумачальнай работы з бацькамі. Усё ж такая важная інфармацыя не можа агучвацца ў апошнія дні перад летнімі канікуламі, да таго ж і педагогі павінны мець гарантыі свайго будучага працаўладкавання.

— Мы вельмі адказна ставімся да гэтай працы і скрупулёзна аналізуем інфармацыю літаральна па кожнай установе адукацыі, якую мясцовыя ўлады плануюць закрыць, — запэўнівае Ірына Каржова. — Абавязкова ў даведцы, што трапляе да нас, павінны ўказвацца колькасць вучняў на сённяшні дзень, дэмаграфічныя перспектывы рэгіёна (наяўнасць дзяцей дашкольнага ўзросту), як будзе арганізаваны падвоз навучэнцаў, у якія ўстановы адукацыі, ці будуць працаўладкаваныя педагагічныя і тэхнічныя работнікі са школы, якая ліквідуецца, ці была праведзена з бацькамі вучняў інфармацыйна-тлумачальная работа. Усё гэта мы вывучаем і толькі на падставе ўсебаковага аналізу вырашаем, што рабіць: або ўзгадніць рашэнне мясцовых органаў кіравання адукацыяй, або дадаткова прапрацаваць пытанне па канкрэтных установах адукацыі.

Напрыклад, згодна з санітарнымі нормамі і правіламі ў выпадку арганізацыі падвозу вучняў у гарадах і сельскіх населеных пунктах радыус транспартнай даступнасці ўстаноў адукацыі не павінен па часе перавышаць 30 хвілін. А здараецца, што ў інфармацыі па запланаваным закрыцці школ фігуруюць зусім іншыя лічбы — 40, 45 і нават 50 хвілін. Канешне, мы на такое ніколі згоду не дадзім. Калісьці дзейнічала абмежаванне ў 30 кіламетраў. Але і дарогі могуць быць розныя, і дзяцей возяць не толькі па шашы. І не толькі на школьных аўтобусах. Для падвозу выкарыстоўваюцца і маршрутныя аўтобусы (у гэтым выпадку расклад іх руху ўзгадняецца з раскладам школьных заняткаў), і прыгарадныя, і мясцовыя цягнікі, і транспарт сельскагаспадарчых і іншых арганізацый.

стар. 2,3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Дыялогі «МС»



Сенатар Анатоль Грышук аб заканатворчай дзейнасці, дабрачыннасці на карысць малой радзімы і пачуцці гумару. стар. 15

### Смачна есці?



Якія парушэнні ў школьных «сталоўках» былі выяўленыя падчас маніторынгаў. стар. 3

### З дастаўкай на ўрок




Як арганізавалі падвоз вясковых школьнікаў у рэгіёнах. стар. 4,13

### Памяць у граніце




Былыя вучні паставілі помнік... знесенай школе. стар. 13

### Блакітныя мроі



Чытачка пытае: «Ці «прыйдзе» газ у Пагарэльцы?» Адказ на яго шукала «МС». стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Эканоміцы — пільная ўвага

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч у аўторак, 5 лютага, прыняў удзел у нарадзе ў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнка з эканамічным блокам Савета Міністраў, паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента.**

У цэнтры ўвагі былі пытанні міжнароднага супрацоўніцтва, развіцця эканомікі, павышэння эфектыўнасці працы асобных прадпрыемстваў. Асаблівая ўвага аддадзена мерам па далейшым паляпшэнні дзелавога асяроддзя ў краіне.

* * *

**Учора, 7 лютага, спікер верхней палаты парламента, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Міхаіл Мясніковіч здзейсніў рабочую паездку ў Баранавічы.**

Тут ён прыняў удзел у нарадзе па пытаннях рэалізацыі комплекснага плана мерапрыемстваў па ўстойлівым сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна да 2020 года. Падчас нарады былі заслуханы справаздачы службовых асоб аб праведзенай рабоце.

У гэты ж дзень спікер верхняй палаты беларускага парламента прыняў удзел у адкрыцці навучальнага корпуса № 2 Баранавіцкага каледжа лёгкай прамысловасці імя Чарнышова.

* * *

**На мінулым тыдні, 31 студзеня, адбылося пасяджэнне рэспубліканскага клуба дырэктараў.**

Паўдзельнічаў у ім і член Прэзідыума Савета Рэспублікі, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў. Тэмай абмеркавання стала «Беларуская эканоміка на шляху ўстойлівага росту». Парламентарый выступіў пры абмеркаванні асноўных напрамкаў макраэканамічнай палітыкі і параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у гэтым годзе.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі таксама кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых органаў улады, прадстаўнікі міжнародных арганізацый і дзелавой супольнасці.

# Што цікавіць?

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Уладзімір Панцюхоў адказаў на пытанні грамадзян падчас прамой тэлефоннай лініі.**

У суботу, 2 лютага, у Савеце Рэспублікі старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў правёў прамую тэлефонную лінію па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Пастаяннай камісіі.

Ад грамадзян паступілі прапановы па ўдасканаленні падатковага заканадаўства ў частцы спрашчэння падатковага адміністравання. Таксама заяўнікі задавалі пытанні, што датычыліся будаўніцтва жылля і якасці работы жыллёва-камунальных службаў.

Усім тым, хто патэлефанаваў на прамую лінію, парламентарый даў неабходныя тлумачэнні і рэкамендацыі.

# ДОБРАСУСЕДСТВА І ЎЗАЕМНЫ ІНТАРЭС

**Спікер верхняй палаты беларускага парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь Артурам МІХАЛЬСКІМ.**



Фота БелТА.

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, на сустрэчы абмяркоўвалася падрыхтоўка афіцыйнага візіту ў Польшчу парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь, запланаванай на наступны тыдзень, — з 11 да 14 лютага. Беларускі бок надае вялікае значэнне візіту, адзначыў Міхаіл Мясніковіч, які ўзначаліць парламенцкую дэлегацыю. Ён выказаў надзею, што візіт будзе змястоўны і канструктыўны.

— Хацелася б, каб тыя прапановы і ідэі, якія стануць прадметам абмеркавання, былі на карысць нашым адносінам, — адзначыў спікер верхняй палаты беларускага парламента. Ён дадаў, што ўзаемаадносіны паміж Беларуссю і Польшчай складваліся часам няпроста, аднак прынцыповых разыходжанняў не было.

— Мы — суседзі і нашы ўзаемаадносіны маглі б быць больш дынамічнымі і сістэмнымі. Хацелася б пачуць меркаванне польскага боку на гэты конт, — звярнуў увагу Міхаіл Мясніковіч.

У сваю чаргу пасол выказаў упэўненасць у тым, што плануемы візіт будзе садзейнічаць выхаду супрацоўніцтва на новы ўзровень.

— Патэнцыял для развіцця партнёрства ў нашых краін вялікі. Ваш візіт — гэта добрая магчымасць абмеркаваць існуючыя прапановы і ініцыятывы, — адзначыў дыпламат.

У рамках візіту ў краіну-суседку запланаваны сустрэчы спікера верхняй палаты беларускага парламента з прэзідэнтам Польшчы Анджэем Дудай і прэм'ер-міністрам Матэвушам Маравецкім. Таксама пройдуць перагаворы Міхаіла Мясніковіча з маршаламі сената і сейма гэтай краіны Станіславам Карчэўскім і Марэкам Кухцінскім.

Акрамя таго, пройдзе сустрэча старшыні Савета Рэспублікі з міністрам замежных спраў Польшчы Яцэкам Чапутовічам. На сустрэчах у цэнтры ўвагі будуць актуальныя для абодвух бакоў пытанні — гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, узаемадзеяння ў галіне адукацыі, навукі, культуры і іншых сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Асаблівую ўвагу ў рамках сустрэч аддадуць ролі парламенцкага вымярэння ва ўмацаванні беларуска-польскіх адносін. Запланавана падпісанне дагавора аб сацыяльным забеспячэнні.

У рамках візіту Міхаіл Мясніковіч таксама наведае памежны Беласток, дзе сустрэнецца з прадстаўнікамі беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, кіраўніцтвам Падляскага ваяводства, наведае Беластоцкі медыцынскі ўніверсітэт.

Кампетэнтна



Фота БелТА.

**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь:**

«Звяртаю ўвагу кіраўнікоў упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў і камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама на неабходнасць не толькі прадстаўляць у міністэрства планы па аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, але і прытрымлівацца іх — падкрэсліў міністр на выніковай калегіі Міністэрства адукацыі. — Такія рашэнні павінны прымацца абгрунтавана, з улікам перспектыў развіцця рэгіёна. Пры гэтым трэба загадзя вырашыць усе пытанні з падвозам навучэнцаў да месца вучобы і назад, на 100 працэнтаў арганізаваць іх бяспеку».

# ЭКАНОМІЯ ЗА ЯКАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Можа, дзесьці ўжо не патрабуецца захаванне сярэдняй і базавай школы, дык пакіньце там пачатковую і не вазіце малечу за 15—20 кіламетраў ад дому. А калі ў вёсцы ёсць яшчэ і дашкольнікі, і мы ведаем, што праз год-два там будуць сем-восем першакласнікаў... Бацькоў таксама можна зразумець, каму спадабаецца, калі малое будзе штодня ў дарозе да адной гадзіны... А для дашкольнікаў увогуле лепш за ўсё знаходзіцца ва ўстанове адукацыі па месцы пражывання. Калі няма магчымасці ўтрымліваць маленькі дзіцячы садок і маленькую школу, выйсце ёсць — яны аб'ядноўваюцца ў вучэбна-педагагічны комплекс «дзіцячы сад — пачатковая школа» ці «дзіцячы сад — базавая школа».

## Пяць вучняў у класе — гэта крытычна?

У бягучым навучальным годзе ў сельскай мясцовасці ажыццяўляецца падвоз 72,3 тысячы навучэнцаў і для гэтых мэт выкарыстоўваюцца каля 1590 школьных аўтобусаў. У адпаведнасці з нашай інструкцыяй пры арганізацыі падвозу школьнікаў у аўтобусе абавязкова павінен прысутнічаць педагагічны работнік, які кантралюе, каб дзіця села ў транспартны сродак, даехала, перайшло дарогу пад наглядам дарослага і зайшло ў школу. У абавязковым парадку прыпынкі грамадскага транспарту, дзе вучняў збірае школьны аўтобус, павінны быць абсталяваныя, каб дзеці маглі схавацца ад снегу, сонца і дажджу. З 1 студзеня педагагічным работнікам устанаўліваюцца надбаўкі, якія ўлічваюць галіновыя асаблівасці педагагічнай дзейнасці. У пераплік відаў работ, за выкананне якіх кіраўніком установы адукацыі могуць устанаўлівацца надбаўкі, увайшло і суправаджэнне навучэнцаў пры арганізацыі іх падвозу ва ўстановы адукацыі: за гэту работу памер надбаўкі можа дасягаць 150 %



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ад тарыфнай стаўкі першага разраду.

У Міністэрстве адукацыі канстатуюць, што ў апошнія гады шмат школ было закрыта ў Віцебскай вобласці, таму што там шмат хутарскіх пасяленняў і, адпаведна, невялікіх школ...

«А якую ўстанову адукацыі можна лічыць малакамплектнай? Што разумець пад малой напаўняльнасцю класа? І колькі ўвогуле вучняў павінна быць у 10 і 11 класах, каб старшую ступень школы можна было захаваць?» — пацікавіліся мы ў намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі.

— У нашым заканадаўстве няма дакладнага азначэння, што такое малакамплектная школа, — тлумачыць Ірына Каржова. — Да таго ж колькасць навучэнцаў — не адзіны фактар, які становіцца прычынай закрыцця ўстановы адукацыі.

У бацькоў не павінна застацца ўражання, што на іх дзецях вырашылі сэканоміць.

Калі, напрыклад, школа знаходзіцца ў аварыйным стане ды яшчэ і ў прыстасаваным будынку, то пралічваецца, што больш эканамічна мэтазгодна — адрамантаваць яго ці арганізаваць падвоз у бліжэйшую школу. Ці дастаткова ў аддзела адукацыі транспарту або трэба будзе дадаткова закупляць школьныя аўтобусы, якія таксама трэба ўтрымліваць і выплачваць заробак кіроўцам? Ёсць школы, дзе адсутнічае спартыўная зала ці яна сумешчана з актавай. Дзе няма ўмоў для арганізацыі паўнавартаснага харчавання навучэнцаў. Канкрэтных лічбавых крытэрыяў, з якой колькасцю навучэнцаў школа можа быць закрыта, няма.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# СМАЧНА ЕСЦІ?

## Маніторынг школьных «сталовак» выявіў парушэнні нормаў, завышэнне цэн, недаважкі

**Міністр адукацыі Ігар Карпенка на калегіі міністэрства агучыў вынікі маніторынгу харчавання ва ўстановах адукацыі, які праводзіўся ў 2018 годзе. Сярод выяўленых недахопаў — парушэнні санітарных нормаў, завышаныя цэны, недаважкі.**

Маніторынг закрануў 118 устаноў адукацыі розных відаў. «Выяўлены шэраг парушэнняў: адсутнасць кантролю за арганізацыяй харчавання з боку кіраўнікоў устаноў адукацыі, парушэнні санітарна-гігіенічных нормаў, адсутнасць альбо няякаснае вядзенне адпаведнай дакументацыі, завышэнне цэн на прадукцыю, якая пастаўляецца, і гатовыя стравы, недаважкі, недаўкладанні і іншае», — праінфармаваў міністр.

Ігар Карпенка адзначыў, што парушэнні дапускаліся, нягледзячы на тое, што былі распрацаваны пакрокавыя рэкамендацыі па арганізацыі харчавання. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты 1 633 работнікі, з іх 339 — кіраўнікі, звольнены 22 чалавекі.

Вывучаецца пытанне адносін бацькоў і навучэнцаў да арганізацыі школьнага харчавання. Вынікі апытання неадназначныя: 57,7 % школьнікаў і 61,2 % бацькоў адзначылі, што якасць іх задавальняе, незадаволеныя — 39 % і 24,2 % адпаведна. «Даследаванне паказвае, што на месцах недапрацоўваюць у арганізацыі харчавання, перш за ўсё кіраўнікі ўстаноў адукацыі», — канстатаваў міністр.

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** падкрэсліў, што пытанні арганізацыі харчавання застаюцца на кантролі ўрада. Ён канстатаваў, што эфектыўная сістэма кантролю ў гэтай сферы пакуль што не створана. Таму даручыў Міністэрству адукацыі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя і МАРГ у першым паўгоддзі правесці маніторынг выканання даручэнняў урада па якасці школьнага харчавання і падаць свае прапановы, у тым ліку з ацэнкай работы кадраў.

**Паводле БелТА.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЦІ БАРАЦЬБА АДУКАЦЫІ?

Усё вырашаецца ў кожным канкрэтным выпадку. Але калі ў дзясятым класе налічваецца менш як пяць вучняў, то, хутчэй за ўсё, захоўваць старшую ступень не будуць. Прычым зроблена гэта будзе не ў мэтах эканоміі, а для забеспячэння якасных умоў для атрымання адукацыі. Увогуле, калі на месцах праводзіцца інфармацыйна-тлумачальная работа з бацькамі, іх увагу трэба засяроджваць не на тым, наколькі даражэй дзяржаве абыходзіцца ўтрыманне навучэнца ў невялікай сельскай школе, а на якасці адукацыйнага працэсу. Ці можна яе забяспечыць? Менавіта гэта акалічнасць для нас галоўная.

Трэба разумець, што вынікова навучання залежыць ад многіх фактараў: і ад прафесійнага ўзроўню педагогаў (а ў малакамплектных школах нярэдка адзін настаўнік вымушаны выкладаць адразу некалькі дысцыплін), і ад матэрыяльна-тэхнічнай базы (наяўнасці адпаведнага вучэбнага абсталявання, магчымасці выкарыстоўваць інфармацыйна-камунікацыйныя рэсурсы і гэтак далей), і ад асяроддзя.

> Трэба ўважліва ўнікаць у кожную сітуацыю, а не гнацца за ўяўнай эканоміяй.

У апошнія гады ў рамках дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» ажыццяўляецца цэнтралізаваная пастаўка вучэбнага абсталявання для кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі. Таксама школы аснашчаюцца мультымедыйнымі дошкамі. Давайце будзем шчырымі, наколькі мэтазгодна пастаўляць сучаснае нятаннае абсталяванне ў малакамплектную школу, размешчаную ў населеным пункце, у якога няма перспектыў? Не варта забывацца і пра важнасць сацыялізацыі, стварэння ў класе канкурэнтнага асяроддзя, пра матываванасць на вучобу і поспех саміх дзяцей.

Трэба ўмець кантактаваць з равеснікамі. Наяўнасць дзіцячага калектыву, грамадскай арганізацыі, удзел у грамадскім жыцці школы — усё гэта абавязковыя складнікі паспяховай сацыялізацыі навучэнцаў. Усе школьнікі маюць права вучыцца ў добра абсталяваных кабінетах, набываць навыкі работы ў камандзе — у парах ці групах, займацца ў спартыўнай зале, а не ў прыстасаваным пад урокі фізічнай культуры памяшканні і гэтак далей. Таму, калі мы закрываем малакамплектныя школы, робіцца гэта з улікам інтарэсаў дзяцей.

### Калі бацькі выратавалі школу...

Ірына Каржова канстатуе, што практычна кожны год у Міністэрства адукацыі звяртаюцца бацькі вучняў школ, якія мясцовыя ўлады плануюць рэарганізаваць або закрыць. І гэта лакмусавая паперка няякасна праведзенай на месцах тлумачальнай работы. Хвалююцца і педагогі, няўпэўненыя ў тым, што з 1 верасня яны не застануцца без працы. Хоць пры ліквідацыі ўстановы адукацыі ў абавязковым парадку павінен выконвацца пункт, у якім прапісваецца абавязак аддзела адукацыі вырашыць пытанне з працаўладкаваннем кадраў.

> Канкрэтных лічбавых крытэрыяў, з якой колькасцю навучэнцаў школа можа быць закрыта, няма.

Здараецца, што дзякуючы актыўнасці бацькоў школу ўсё ж такі ўдаецца захаваць ці адкласці рашэнне з яе закрыццём, пакуль не будуць вырашаны прынцыповыя пытанні, напрыклад з тым жа падвозам школьнікаў. Літаральна ў студзені ў Міністэрства адукацыі паступіў сігнал з Круглянскага раёна, дзе мясцовыя органы ўлады разглядаюць магчымасць закрыцця ВПК «Шапялевіцкі дзіцячы сад — сярэдняя школа». Там ёсць пытанні і з падвозам навучэнцаў, і з працаўладкаваннем кадраў. А ці проста ў сельскай мясцовасці знайсці сабе працу? Пакуль Міністэрства адукацыі не ўзгадніла рашэнне аб яго закрыцці.

— Яшчэ раз падкрэсліваю, што ўсе рашэнні аб закрыцці і рэарганізацыі школ павінны прымацца выключна па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі. Аптымізацыя сеткі навучальных устаноў знаходзіцца на самым высокім кантролі ва ўрадзе. І на першым месцы павінна быць зусім не эканомія, а якасць адукацыі, стварэнне адпаведных умоў для яе атрымання, — звяртае ўвагу Ірына Каржова. — І дзейнічаць трэба выключна ў інтарэсах вучняў. Усё прадумаць, узважыць і растлумачыць. А ў бацькоў не павінна застацца ўражання, што на іх дзецях вырашылі сэканоміць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

❍ ДАВЕДКА

**У 2018/2019 навучальным годзе агульная колькасць школьнікаў упершыню за апошнія дзесяць гадоў перавысіла мільён чалавек. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі навучаюцца 1 мільён 10 тысяч 400 вучняў (на 15,9 тысячы больш, чым у папярэднім годзе), у тым ліку 110 тысяч першакласнікаў. Усяго ў краіне дзейнічаюць 3038 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку тры новыя школы, адкрыццё якіх адбылося напярэдадні 1 верасня: у Мінску (на 1020 месцаў), вёсцы Лескаўка Мінскага раёна (на 720 месцаў) і ў Бабруйску (таксама на 1020 месцаў).**

БАЛЮЧАЕ ПЫТАННЕ

# ГАРНІР ПАД СОУСАМ ЗАКОНА

## У харчаванні школьнікаў працягваюць выяўляцца парушэнні

**Пільны кантроль за школьным харчаваннем вядзецца КДК Гродзенскай вобласці з 2017 года, калі кіраўнік дзяржавы звярнуў на гэтую праблему асабістую ўвагу і даручыў прыняць неадкладныя меры па ліквідацыі недахопаў. За гэты час выяўлена мноства парушэнняў, некаторыя сталі прычынай для ўзбуджэння крымінальных спраў. Нядаўні маніторынг школьных «сталовак» зноў паказаў — ва ўсіх правераных установах былі парушэнні.**

### ВЫНОСІЛІ СЫР, МЯСА, КАЎБАСЫ...

Як паведаміла **начальнік упраўлення КДК Гродзенскай вобласці Наталля ЖУР,** найбольш тыповыя недахопы датычацца санітарных нормаў і правілаў. Не забяспечваецца чысціня харчовых блокаў, посуду, кухоннага інвентару, асабістая гігіена персаналу. Не выконваюцца натуральныя нормы харчавання. Працягваецца практыка закупкі тавараў праз пасрэдніцкія структуры, ёсць факты выкарыстання звыш нарматыву гандлёвых надбавак. У выніку кантрольных мерапрыемстваў больш за 100 чалавек летась прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці. І гэта пры тым, што ў кожным райвыканкаме створаны камісіі па кантролі за арганізацыяй харчавання школьнікаў, зазначыла Наталля Жур.

Чарговая праверка была праведзена напярэдадні новага года, у снежні. Кантралёры пабывалі ў трох сярэдніх школах вобласці — і ўсюды знайшлі парушэнні. Напрыклад, у сярэдняй школе ў Вялікай Бераставіцы была недаважка порцый гуляшу на 32 %, хлеба — на 33 %. Пры гэтым лішкі свініны пры прыгатаванні стравы склалі 1,6 кілаграма.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сталовай Гродзенскага абласнога кадэцкага вучылішча знойдзены лішкі прадуктаў, якія былі нарыхтаваны на вынас — яблыкі, сок, марынаваныя агуркі, сыр, катлеты, мандарыны.

А вось суп, наадварот, на 4 кілаграмы меў лішнюю вагу. Гэта адбылося з-за павелічэння закладкі вады. Такая ж тэхналогія выяўлена ў прыгатаванні плову. Страва амаль на 5 кілаграмаў перавышала норму з-за вады.

У сталовай СШ № 3 Гродна кантралёры пераважылі 115 порцый варанай каўбасы, якая была прыгатавана на сняданак. Пры гэтым не далічыліся 1,3 кілаграма прадукта. Яшчэ 2,2 кіло каўбасы прызначаліся на вынас. У гэтай жа ўстанове знайшліся лішкі вады ў фаршы пры прыгатаванні тэфтэляў.

Крадзеж прадуктаў харчавання выяўлены праваахоўнымі органамі ў сярэдняй школе № 40 абласнога цэнтра. Са сталовай было вынесена прадуктаў на суму больш за 200 рублёў (8 кілаграмаў свініны, 5 кілаграмаў курацiны, па 6 кіло масла і сыру).

За парушэнні ў арганізацыі харчавання работнікі прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, з некаторымі скасаваны працоўныя адносіны. Пакараны і дырэктары школ, якія не забяспечылі пэўны кантроль за харчаваннем школьнікаў.

*(Працяг на 4, 13-й стар. «МС».)*

# З ДАСТАЎКАЙ НА ЎРОК

**Аляксандр ЖЭБІН абслугоўвае адзін з васьмі школьных маршрутаў Краснапольскага раёна, курсуе на жоўтага колеру аўтобусе па гарадскім пасёлку і крыху за яго межамі. Працоўны дзень пачынаецца з перадрэйсавага агляду, а ў сем гадзін раніцы ён ужо забірае дзяцей з прыгараднага пасёлка «Усход», які за некалькі кіламетраў ад школы.**

— У аўтобусе на 22 месцы 18 чалавек плюс суправаджальнік — настаўнік школы, — дае ён справаздачу. — Дзяцей на маім маршруце не так многа, таму дастаткова аднаго рэйса раніцай у школу і яшчэ аднаго ў абед са школы. Галоўнае, каб у салоне ніхто з дзяцей не стаяў. Гэта адсочваецца строга. Усе едуць прышпіленыя рамянямі, і гэта кантралюе суправаджальнік.

Правілы перавозкі вельмі строгія, адзначае суразмоўнік. Тэхнічныя агляды транспартнага сродку трэба праходзіць двойчы на год. А вось калі ўзнікне неабходнасць ехаць у той жа Магілёў, прыходзіцца рабіць пазапланавы агляд.

У Краснапольскім раёне функцыянуе дзевяць школ і пяць дзіцячых садкоў, дзе вучацца і выхоўваюцца 1357 і 415 дзяцей адпаведна. Усяго ў раёне падвозяць 149 дзяцей (з іх 14 дзяцей-інвалідаў) з 27 населеных пунктаў. Падвоз ажыццяўляецца згодна з рашэннем выканаўчага камітэта, якое прымаецца штогод у канцы жніўня і зацвярджае маршруты, населеныя пункты, колькасць дзяцей. У раённым бюджэце плануюцца сродкі на абслугоўванне школьнага транспарту.

— Парк у нас новы, толькі адзін аўтобус працуе дзесяць гадоў, і сёлета за сродкі абласнога бюджэту плануецца яго замяніць, — адзначае **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Краснапольскага райвыканкама Надзея СІНКЕВІЧ.** — Апошні раз школы ў раёне аптымізаваліся ў 2016 годзе. Для вучняў, а на дзве школы іх было 36, быў арганізаваны падвоз. Калі школу аптымізуюць, гэта не значыць, што ўзнікае неабходнасць у дадатковым транспарце. Проста адбываюцца змены ў руху — адным маршрутам можам падвозіць школьнікаў у некалькі ўстаноў.

Нараджальнасць, школы, аўтобусы — паняцці непарыўныя. Рэчаіснасць такая, што сёння колькасць сельскіх вучняў памяншаецца і школы на вёсцы вымушаны закрывацца. Вельмі дорага абыдзецца дзяржаве вучань, дзеля якога трэба трымаць штат настаўнікаў і эксплуатаваць асобны будынак. Аўтобусы з паметкай на борце «школьны» даюць магчымасць вырашыць гэтую праблему і з камфортам даставіць дзіця ў дзіцячы садок або школу. У Магілёўскай вобласці сёння курсуе 263 такія аўтобусы, іх паслугамі карыстаюцца 8296 дзяцей.

Па словах **начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення фінансава-гаспадарчага забеспячэння ўстаноў адукацыі Юліі КУЗЬМЯНКОВАЙ,** праблем у сельскіх населеных пунктах з транспартам для падвозу дзяцей у школу і назад у вобласці няма. Летась за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў былі абноўлены 22 адзінкі транспарту, сёлета плануецца абнавіць яшчэ 24. Амаль 50 % школьных аўтобусаў, якія займаюцца дастаўкай дзяцей у школы вобласці, знаходзяцца ў эксплуатацыі ўсяго да пяці гадоў. Дарэчы, ёсць аўтобусы на 22, 27 і 31 месцы.

**Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Сяргей СЫРАНКОЎ:**

— Аптымізацыя і рацыяналізацыя сеткі ўстаноў адукацыі, якая праводзіцца ў рэгіёне, абумоўлена ў першую чаргу памяншэннем колькасці дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту, нізкай напаўняльнасцю класаў, што не дазваляе ў поўнай меры задаволіць патрэбы насельніцтва ў адукацыйных паслугах. Галоўная задача аптымізацыі — зрабіць у кожным рэгіёне эфектыўную сетку ўстаноў адукацыі, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням і забяспечваюць высокую якасць адукацыі.

Адначасова з закрыццём малакамплектных школ паўстае пытанне дастаўкі вучняў да новага месца навучання. Бо кожнае дзіця, незалежна ад таго, дзе яно пражывае, павінна мець магчымасць атрымаць якасную сучасную адукацыю. У сельскай мясцовасці гэтая задача ўскладняецца тым, што школу і дом часам аддзяляюць кіламетры. Таму пытанне папаўнення і абнаўлення школьнага аўтапарка — гэта патрабаванне часу. Для гэтага ў Магілёўскай вобласці прымаюцца ўсе неабходныя меры.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ПРЫПЫНАК

## Амаль тысячу школьнікаў штодня

**Вучэбна-педагагічны комплекс «Дзіцячы сад-сярэдняя школа» ў Дружылавічах — сярэдняя па велічыні ўстанова адукацыі па мерках цяперашняй палескай вёскі. Тут навучаецца 87 школьнікаў і 18 дашкольнікаў. Палову дзяцей падвозяць на заняткі школьным аўтобусам.**

рэйс у Шчакоцк, дзе забірае 20 дзяцей, потым з Замошша прывозіць 25 вучняў, і нарэшце шэсць школьнікаў дастаўляе з вёскі Трыліскі. Па дамах навучэнцаў развозяць два разы на дзень: спачатку пасля ўрокаў, потым вучняў з групы падоўжанага дня і дашкольнікаў з садка.

Ранкам дзяцей суправаджаюць дзве настаўніцы на змену, а пасля абеду малых і падлеткаў дастаўляе бацькам сацыяльны педагог Таццяна Райкевіч. Паводле слоў дырэктара, графік суправаджэння складаецца ў пачатку года. Гэта грамадскае даручэнне атрымліваюць мясцовыя настаўнікі. Бо некаторыя педагогі ездзяць на працу з горада, яны прывязаныя да раскладу грамадскага транспарту, і ім, вядома, было б вельмі нязручна. У калектыве на конт гэтага ёсць згода. «Усе мы разумеем, што адказваем за жыццё і здароўе дзяцей не толькі падчас урокаў, але і да самага вяртання дадому, — гаворыць дырэктар, — таму ніякіх пытанняў не ўзнікае. (Цікава, што размову аб рабоце па суправаджэнні на грамадскіх пачатках мы вялі 30 студзеня, а 31-га стала вядома, што педагогам за гэта даплацяць. — **Аўт.**)




На фота — аўтобусы, якія займаюцца падвозам дзяцей да Гарбавіцкай школы ў Чавускім раёне.

### Тры рэйсы зранку і шэсць пасля абеду

За школай замацаваны асобны аўтобус. **Кіроўца Сяргей Бучык** паказвае сваю машыну жоўтага колеру з эмблемай Банка развіцця: крэслы мяккія, у салоне чысціня і парадак, зверху прымацаваны экран, на які можа транслiравацца відэа. На пасаду школьнага кіроўцы Сяргей Аляксеевіч прыйшоў у 2006 годзе, тады ж і атрымаў гэты аўтобус. Машына захоўваецца ў гаражы мясцовага сельгаспрадпрыемства. Заняткі пачынаюцца ў 8.30, да гэтага часу трэба зрабіць тры рэйсы.

**Дырэктар школы Святлана ЛЯХАВЕЦ** гаворыць, што сістэма падвозу, маршруты, прыпынкі даўно адпрацаваны. Дакумент на гэты конт зацвярджаецца ў райвыканкаме перад пачаткам кожнага навучальнага года. У іх выпадку аўтобус робіць першы

Таццяна Райкевіч паказвае адмысловы сшытак, дзе яна кожны дзень адзначае вучня, які выйшаў на прыпынку каля свайго дома, у ім жа калега ранкам адзначыла, што вучань прыехаў на заняткі. Школьнікі выходзяць на прыпынку і бягуць дадому самі, выхаванцаў садка забіраюць бацькі ці дарослыя члены сям'і. Такі парадак.

# ГАРНІР ПАД СОУСАМ

### ДЫРЭКТАР, ЯКАЯ ТРАПІЛА ПАД СУД

Зараз у Ленінскім судзе Гродна якраз і разглядаецца справа, якая датычыцца злосных парушэнняў у сферы школьнага харчавання. На лаве падсудных апынулася дырэктар камбіната школьнага харчавання. Яна абвінавачваецца ў тым, што з 2015 да 2018 года атрымлівала грошы і матэрыяльныя каштоўнасці за спрыяльнае рашэнне пытанняў, якія ўваходзяць у яе кампетэнцыю. Крымінальная справа ўзбуджана за хабар і злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі.

Грошы жанчына брала за тое, каб не праводзіліся ў школах пазапланавыя праверкі вытворчай дзейнасці, і не рэгістраваліся парушэнні, якія дапускаюць работнікі сталовай. Напрыклад, яна атрымлівала хабар за тое, што закрывала вочы на прысваенне ўтвораных лішкаў прадуктаў і на прычыненую страту. Брала грошы за працяг працоўных кантрактаў, узгадненне дакументацыі па спісанні інвентару, нават за дазвол на працоўны адпачынак. Яна сістэматычна давала ўказанні галоўнаму бухгалтару па выдачы матэрыяльнай дапамогі сваім падначаленым. Пры гэтым яны атрымлівалі толькі палову, другую дырэктар забірала сабе.

Падчас папярэдняга расследавання высветлена 75 эпізодаў атрымання хабару на суму каля пяці тысяч рублёў. Практычна штомесяц загадчыкі вытворчай школьных сталовых перадавалі свайму дырэктару ад 50 да 150 рублёў.

Акрамя гэтага, кіраўнік камбіната школьнага харчавання абвінавачваецца ў 19 эпізодах крадзяжу маёмасці прадпрыемства на суму больш за 11 тысяч рублёў, што лічыцца буйным памерам.

Дырэктарку затрымалі праваахоўнікі на рабочым месцы з доказамі злачынства пры атрыманні хабару ў памеры 500 рублёў. У рамках адной справы злучана 30 крымінальных спраў, узбуджаных у адносінах службовай асобы. Жанчына затрымана і знаходзіцца пад вартай, на яе маёмасць накладзены арышт. Як паведамілі ў прэс-службе Гродзенскага абласнога суда, ёй пагражае ад 3 да 10 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

У рамках крымінальнай справы будзе дадзена прававая ацэнка дзеянням работнікаў устаноў адукацыі Ленінскага раёна Гродна, якія давалі хабар, а таксама якія здзейснялі правапарушэнні падчас вытворчай дзейнасці.

### СТАЎКА НА ЭЛЕКТРОННЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Каб пазбегнуць злоўжыванняў і крадзяжу, у навучальных установах пачалі ўкараняць сістэму відэанагляду. У Гродне да канца мінулага года такім чынам абсталяваны ўсе харчовыя блокі школ і гімназій. У галоўным упраўленні адукацыі Гродзенскага аблвыканкама паведамілі, што праграма дазваляе выводзіць выяву на асабісты тэлефон дырэктара, а таксама на стацыянарны камп'ютар, за якім сочыць дзяжурны. Як правіла, адна з відэакамер

(Працяг. Пачатак на 3-й стар. «МС».)

Тэлесеткі

# ЯК СКЛЕІЦЬ РАЗБІТЫ КУБАК

Новае рэаліці-шоу прапануе сваім гледачам «Беларусь 2» акурат напярэдадні Дня закаханых, 13 лютага. Называецца гэты тэлепраект, зняты і «абкатаны» расійскімі тэлевізійнікамі ўжо летась, «Муж напракат». Сямейныя пары, у якіх незадаволенасць сужэнцаў адно адным дасягнула крытычнага перадразводнага градуса, спрабуюць усё ж пераадолець крызіс стасункаў з дапамогай псіхолага, дзеля чаго кожны на працягу некалькіх дзён жыве з новым чалавекам, які ўвасабляе для іх бездакорнасць і ідэал: напрыклад, жанчыны «бяруць напракат» узорнага сем'яніна, афіцэра ці вядомага мастака, мужчыны ж правяраюць, што такое жыць побач з перакананай чайлд-фры альбо самадастатковай і ўпэўненай у сабе бізнесвумен.

Псіхолаг і вядучая праекта Іна Чудзінава на ўсіх этапах знаходзіцца побач з героямі і цікавіцца, што іх задавальняе ў пераменах, а што не спраўджвае чаканні. Аказваецца, часта стомленым ад уласнага сямейнага ладу людзям дастаткова, каб іх проста выслухалі, не перабіваючы... У фінале ж кожнаму ўдзельніку трэба шчыра адказаць самому сабе, ці насамрэч усё так дрэнна ў іхняй сям'і і ці такія ўжо ідэальныя новыя партнёры, — а гледачы ўбачаць, якія разбітыя кубкі яшчэ можна скленіць, і, мабыць, зробяць пэўныя высновы для сябе.



# СТАРОЕ, ЛЮБІМАЕ...

Адразу некалькі фільмаўюбіляраў пакажа на наступным тыдні тэлеканал «Беларусь 3».

Так, 13 лютага ў эфіры — камедыя **«Дзяўчына з характарам»**, якая выйшла на экраны СССР 80 гадоў таму. ...У пошуках управы на бюракратакіраўніка, які разваліў некалі квітнеючы далёкаўсходні зверасаўгас, найлепшая работніца гаспадаркі Каця Іванова едзе ў райцэнтр, а адтуль у сталіцу. А па дарозе ўмудраецца злавіць дыверсанта, праехаць у цягніку без білета, затое ў якасці афіцыянткі вагона-рэстарана, уладкавацца на фабрыку грамафонных пласцінак, сагітаваць новых сябровак ехаць на Далёкі Усход і знайсці сардэчнага сябра. У выніку Кацю прызначаюць кіраўніком саўгаса замест звольненага бюракрата, а сама яна з дружнай кампаніяй моладзі вяртаецца ў родную гаспадарку.

Любімы мноствам гледачоў мюзікл **«Мэры Попінс, да пабачэння!»**, з моманту



прэм'еры якога сёлета споўнілася 35 гадоў, будзе паказаны 16—17 лютага. Савецкая кінаверсія гісторыі пра «Міс Дасканаласць» з мноствам цікавых дэталяў, якіх няма ў кнізе, і выдатны акцёрскі ансамбль: Алег Табакоў — міс Эндру, эстонскі акцёр Лембіт Ульфсак — Роберт Эй, Зіновій Герт — адмірал Бум, спецыяльна для ролі схуднелая на 22 кіло Наталля Андрэйчанка — Мэры Попінс, а ў дадатак выдатныя песні ад кампазітара Максіма Дунаеўскага — дзякуючы ўсім гэтым складнікам фільм для многіх і па сённяшні застаецца найлепшай экранізацыяй вядомага твора Памелы Трэверс.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 62

Наступная задача Віктара Зайцава (Гомель) атрымала трэці ганаровы водгук на міжнародным конкурсе маскоўскага часопіса «Шахматная кампазіцыя» *(гл. дыяграму).*




Белыя: Kpf8, Фа4, Лg3, Лh5, Cc8, Cg5, Kd7, Kf3, пп. b6, c3, c5, d2, e6 (13).

Чорныя: Kpd5, Ле5, пп. a5, c4, c6, f6, g4 (7).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У польскай сталіцы адбыўся XVII Гран-пры Варшавы па рашэнні шахматных кампазіцый. Сярод рашальнікаў з дзевяці краін былі і два беларусы — міжнародны майстар Аляксандр Булаўка і Мікалай Сігневіч. У «адкрытым турніры» А. Булаўка падзяліў 3—4 месцы з экс-чэмпіёнам свету Андрэем Селіванавым (Расія), а ў галоўным спаборніцтве заняў «чыстае» трэцяе месца.

* * *

Праграма сёлетняга міжнароднага шахматнага фестывалю ў Оршы складалася з дзясятка разнастайных турніраў, а сярод удзельнікаў быў нават аргенцінец, які вандруе па розных краінах свету. У «адкрытым турніры» (82 гульцы) прызавую тройку склалі гросмайстры Аляксандр Маскаленка (Расія), Аляксей Фёдараў (Беларусь) і міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі (Беларусь). У турніры «В» (25 удзельнікаў) перамог майстар ФІДЭ з Беларусі Юрый Борсук. У кругавым турніры з нормай міжнароднага майстра 1—2 месцы падзялілі Дзмітрый Навіцкі і Вольга Бадэлька (Беларусь), трэці быў Арцём Гогалеў (Расія). А. Гогалеў выйграў турнір па хуткіх шахматах (116 гульцоў), а другі тут быў Сяргей Міхайлоўскі (Беларусь). У турніры-гандыкапе (з форай па часе для слабейшых; 63 удзельнікі) першынстваваў майстар ФІДЭ Валянцін Уласаў (Расія).

Вось адна партыя з Оршы.

Арцём Сіняўскі — Сяргей Міхайлоўскі. 1.e4 e6 2.d4 d5 3.Kc3 Cb4 4.ed ed 5.Cd3 Ke7 6.Ke2 Cf5 7.Cf4 0-0 8.0-0 c6 9. Kg3 Cg6 10.Kce2 Ле8 11.c3 Ca5 12.h4 Kd7 13.h5 C:d3 14.Ф:d3 Kf8 15.h6 g6 16.Фf3 Kc8 17.Лae1 Kd6 18.Kc1 Ke6 19.Ce5 f5 20.C:d6 Ф:d6 21.Ле5 Kg5 22.Фe3 Л:e5 23.de Фe7 24.Kb3 Cb6 25.Kd4 Ke6 26.Фd2 C:d4 27.cd f4 28.Ke2 f3 29.gf Лf8 30.Kpg2 Лf5 31.Лh1 Фf7 32.Фe3 Лg5+ 33.Kg3 Фf5 34.Лh4 Фc2 35.Лf4 Лf5 36.K:f5 gf 37.Лh4 Kpf7 38.Фa3 Фc1 39.Фe3 Ф:b2 40.Фd3, 1:0.

* * *

У Вейк-ан-Зее (Нідэрланды) прайшоў традыцыйны шахматны фестываль — адзін з найстарэйшых і найвядомейшых у свеце. Элітны турнір «А» сёмы раз выйграў чэмпіён свету Магнус Карлсен, а ў турніры «В» (14 удзельнікаў) першы быў беларускі гросмайстар Уладзіслаў Кавалёў — 7 перамог, 6 нічыіх, ніводнага паражэння! У індыйскім Чэнаі (282 удзельнікі) Аляксей Аляксандраў фінішаваў трэці, Кірыл Ступак — шаснаццаты. Прызёрамі першынства Мінска сярод юнакоў да 16—18 гадоў сталі Мацвей Папунідзі, Глеб Буры і Арцём Кутасевіч.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.K:e4. Першымі правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Рамантык, супергерой і секс-сімвал савецкага кіно

## 14 лютага споўнілася б 70 гадоў Мікалаю Яроменку-малодшаму

Ён нарадзіўся ў Віцебску ў сям'і народных артыстаў Мікалая Яроменкі і Галіны Арловай, з маленства шмат бываў у тэатры, а таму лагічна абраў для сябе акцёрскі шлях, скончыў Усесаюзны інстытут кінематаграфіі і ў 20-гадовым узросце дэбютаваў у вялікім кіно — але вядомым стаў не дзякуючы бацькоўскай пратэкцыі, а па сукупнасці ўласнага таленту і рыс характару. Нездарма ж Яроменку-малодшага прызналі найлепшым савецкім акцёрам 1980 года, а праз некалькі гадоў ён атрымаў званні заслужанага, а потым і народнага артыста Расійскай Федэрацыі. У дзень нараджэння акцёра і рэжысёра сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» пакажа адну з апошніх яго кінаработ — фільм «Падары мне месячнае святло», а «Звязда» прапануе прыгадаць некалькі самых яркіх з больш чым 50 роляў Мікалая Яроменкі-малодшага.

### Жульен Сарэль, «Чырвонае і чорнае» (1976)

У гэтай гістарычнай драме акцёр сыграў галоўную ролю — амбіцыйнага маладога чалавека, які прыязджае з правінцыі скарыць Парыж, але ў выніку праводзіць час у абдымках заможнай каханкі і здраджвае ўласным — былым — ідэалам.

### «31 чэрвеня» (1978)

Мастак XXI стагоддзя Сэм Пэнці шукаў вобраз дзяўчыны для рэкламы і ўсё ніяк не мог злавіць музу. А калі атрымалася — убачыў у люстэрку і ўмудрыўся пакахаць дзяўчыну з далёкага мінулага — прынцэсу XII стагоддзя Мілісэнту з каралеўства Перадор. Каб зберагчы сваё пачуццё, закаханым трэба падарожнічаць між двух сусветаў і супрацьстаяць злому чараўніку... Гэту фантастычную музычную казку, па чутках, чыноўнікі ад кіно доўгі час не хацелі выпускаць



на экран, а песню «31 чэрвеня» нават забаранялі выконваць на сцэне — і тым не менш карціна знайшла шлях да гледача і палюбілася на доўгія гады.

### «Піраты XX стагоддзя» (1979)

Брутальны старшы механік сухагруза Сяргей Сяргеевіч — не вытанчаны прыгажун, не летуценны рамантык, у вобразе якога гледачы запомнілі акцёра раней. У гэтым прыгодніцкім баевіку Мікалай Яроменка-малодшы сыграў героя, які хоць і не выратоўвае цэлы свет, але затое адбівае ў ліхадзеяў экіпаж і каштоўны груз карабля, практычна ў адзіночку распраўляючыся з піратамі. Ці варта здзіўляцца, што фільм стаў не толькі лідарам кінапракату ў 1980-м, але і адным з самых касавых у СССР, а Мікалай Яроменка — кумірам савецкіх гледачоў?

### «У пошуках капітана Гранта» (1985)

Тут Яроменка — лорд Эдуард Гленарван, які знаходзіць запіску зніклага капітана Гранта і вырашаецца на кругасветнае плаванне, каб адшукаць чалавека, якога раней ніколі не бачыў, і дапамагчы яго дзецям... Скажыце толькі, што вы не пераглядалі ў дзяцінстве гэты шматсерыйны прыгодніцкі фільм па некалькі разоў!

### «Сын за бацьку» (1995)

За гэты фільм, дзе акцёр таксама дэбютаваў у якасці рэжысёра, ён узяўся дзеля бацькі, які доўгі час нідзе не здымаўся. Атрымаўся выдатны сямейны і акцёрскі дуэт: Мікалай Яроменка-старэйшы сыграў пластычнага хірурга, які з прыходам жорсткіх рынкавых адносін застаўся без работы, а Мікалай Яроменка-малодшы — яго сына Віктара, які дапамагае бацьку адкрыць прыватную клініку і разам з ім становіцца на шляху крымінальных аўтарытэтаў, якія жадаюць «падмяць» прыбытковы бізнес пад сябе.

### «Падары мне месячнае святло» (2001)

Фільм Дзмітрыя Астрахана, дзе Яроменка-малодшы сыграў папулярнага тэлежурналіста, які заблытаўся ў стасунках паміж жонкай і каханкай, выйшаў на экраны пасля смерці акцёра, а прэм'ера яго на сочынскім фестывалі «Кінатаўр» суправаджалася скандалам. Так, у цітрах меладрамы адсутнічалі імёны рэжысёра і аўтара сцэнарыя — тыя адмовіліся ўносіць у карціну змяненні, прапанаваныя прадзюсарамі, пераключыліся на іншы праект і заявілі, што не будуць мець нічога агульнага з «прадзюсарскай» версіяй. Але, на шчасце, гэтыя пост-пракатныя разбіральніцтвы не паўплывалі на ўспрыманне гледачамі самога сюжэта карціны і сямейнай пары, якую сыгралі Мікалай Яроменка і Наталля Андрэйчанка.






# Рыштоак: проці ліха на ўзгорачку

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ўжо які год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...**

А пакуль усе, хто цікавяцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць узяць удзел у віктарыне, могуць праверыць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам, ці ведалі вы, што:

**амша́нік** — уцепленае памяшканне для зімоўкі пчол;

**віці́на** — крытае судна для перавозкі збожжа па рацэ;

**ляда́шчы** — кволы, нядужы, дрэнны; старты, струхлелы;

**рухля́к** — рыхлая асадкавая горная парода, якая складаецца з гліны і дробных кавалачкаў вапны;

**рышто́к** — жалабок, канаўка, раўчук для сцёку вады;

**піро́п** — каштоўны камень чырвонага колеру, разнавіднасць граната;

**папа́р** — поле, пакінутае на адно лета незасеяным з мэтай паляпшэння глебы;

**эспадро́н** — вучэбная зброя, якая прымяняецца ў фехтаванні;

**ца́ля** — мера даўжыні, роўная 2,54 см;

перабраць меру — зрабіць лішняе, хапіць цераз край (*беларускія сінонімы:* кій перагнуць, праз меру ўзяць; *рускія адпаведнікі:* перегнуть палку, хватить через край);

у віру на калу — пра няўстойлівае, непэўнае жыццё; далёка, невядома дзе (*беларусы яшчэ скажуць:* у вірах на юрах, у чортавых зубах, проці ліха на ўзгорачку; *рускія:* у черта на куличках).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Усход — Захад-2» (16+).**
**12.35, 13.05, 15.25 Меладрама «Два берагі надзеі» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нашы» (6+).
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.40** «Арэна».
**0.40** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
**10.05** «Капейка ў капейку» (12+).
**10.40** «Свет навыварат. Непал» (16+).
**11.35** М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды» (12+).
**12.25** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**13.15** Анімацыйны фільм «Кураня Цыпа» (0+).
**14.35 Меладрама «Прыслуга» (12+).**
**16.55 Баявік «Чарапашкі-ніндзя» (12+).**
**19.15** «Суперлато».
**21.05, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**22.50** «Хадзі сюды і танцуй».
22.55 Серыял «Самара-2» (16+).
**23.45** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Клёцкі са шкваркамі.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 18.05 «З каханымі не расставайцеся». Меладрама (12+).**
**10.35** «Навукаманія» (6+).
**11.05** «Майстры і куміры». Паэтэса Людміла Паўлікава-Хейдарава.
**12.25** «Люблю і памятаю». Кінарэжысёр, сцэнарыст, акцёр Валерый Рубінчык.
**13.00, 21.45 «Чкалаў». Маст. фільм (16+).**
**13.55** «Партызаны». Кірыл Арлоўскі (12+).
**14.20, 21.05** «Апошні дзень». Уладзімір Зельдзін (12+).
**14.55** «Беларуская кухня». Цымес.
**15.25** «Наперад у мінулае».
**15.55** «Душою дакрануцца да нябёс...» Канцэрт памяці заслужанага артыста БССР Анатоля Кашталапава.
**17.25** «Доказы з мінулага». Ясенін (16+).
**19.20 «Стаўка». Фільм першы «Катастрофа» (12+).**
**20.00** «На прыродзе з Віталём Гуменным». Гродзенская Свіслач.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.35** «Тэатр у дэталях». Спектакль цэнтра «Лабараторыя сацыяльнага тэатра ECLAB». «Родныя людзі?»
**23.05** «Дом, дзе жыве мастацтва». Дак. фільм.

## Беларусь 5

**7.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
**8.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Кэнмар. Масстарт. Мужчыны.
**9.30** Вынікі тыдня.
**10.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Кэнмар. Масстарт. Жанчыны.
**11.00** Вялікі спорт.
**11.45** Тэніс. Кубак Федэрацыі. Германія — Беларусь.
**13.35** Валейбол. Адкрыты чэмпіянат Расіі. «Мінчанка» — «Уралачка-НТМК».
**15.30** Тэніс. WTA. Доха.
**19.00** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Лакаматыў» (Яраслаўль). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вулверхэмптан» — «Ньюкасл». (У перапынку — «Спорт-цэнтр».)

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Дэтэктывы» (16+).**
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Водар шыпшыны» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** Ток-шоу «Наша жыццё».
**22.10 Серыял «Варажбітка» (16+).**
**23.10 Серыял «Выдатніца» (16+).**
**0.55** «Нашы навіны». Галоўнае за дзень.

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «У апошні момант» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40** «Скардзіцца дазваляецца».
**11.10, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**12.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.35, 23.40** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Жывая тэма» (16+).
**14.40** «Дзіўная справа» (16+).
**15.35, 16.50 «Кулінар». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30 «Меч». Серыял (16+).**
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**0.25** «Мінтранс» (16+).
**1.10** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Вясковы раман» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 2.20** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 3.10** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 1.40** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.25, 3.55 Серыял «Таптуны» (16+).**
**22.20, 0.10 Серыял «Напарніцы» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.45** Тайны Беларусі.
**10.45** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30 Серыял «Пыльная работа» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.00** Весткі. Мясцовы час.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Паміж намі, дзяўчынкамі. Працяг» (12+).**
**22.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Беларусы (6+).
**6.40** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.10** «Паедзем, паядзім!» (0+)
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.30** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.10** «Крутая гісторыя» (12+).
**11.55** Пракурорская праверка (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Шэрыф» (16+).**
**15.00, 16.35 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**17.10** «ДНК» (16+).
**18.10, 19.55 Серыял «Неўскі. Праверка на трываласць» (16+).**
**19.40** Сёння. Галоўнае.
**20.50 Серыял «Пяць хвілін цішыні» (12+).**
**22.35** «НЗ.by».
**23.00 Серыял «Чужы твар» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.05, 0.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** «Мультпарад».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію» (6+).**
**9.00** Дак. серыял «Радавая праклёны» (12+).
**9.30, 19.05 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**10.30** Дак. фільм.
**11.00 Меладрама «Зорка чароўнага шчасця» (12+).**
**13.55 Серыял «Хваран» (16+).**
**15.55** «Надвор'е».
**16.30 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**17.20 Драма «Глыбакаводны гарызонт».**
**20.00 Серыял «Мёртвы зыб» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Маўчанне ягнят» (18+).**
**23.15 Баявік «Марскі пяхотнік» (16+).**



## ВТБ

**6.05** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**7.25, 2.50** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.20, 2.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.15** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.35** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.25** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+)
**11.00, 19.25** «Уральскія пельмені» (16+).
**12.00** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**14.00, 22.50** Скетч-шоу «Нерэальная гісторыя» (12+).
**15.00** Мюзікл «Бурлеск» (12+).
**17.15** Фантастыка «Робат па імені Чапі» (16+).
**20.50** Фантастыка «Філасофы: урокі выжывання» (16+).
**0.20** «Хачу верыць!» (16+)
**3.40** «Ералаш» (6+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

**6.30** «Прыгода на плыце». «Казка пра чужыя фарбы». «Лясная гісторыя». М/ф.
**7.35** «Сіта і Рама». Серыял.
**9.55** «Звычайны канцэрт».
**10.25** «Мы — грамацеі!»
**11.10** «Міхаіл Названаў. Апальны пястун лёсу». Дак. фільм.
**11.50, 0.55** «Гаспадыня гасцініцы». Маст. фільм (0+).
**13.20** «Старонкі ісціны. Імам аль-Бухары». Дак. фільм.
**13.45** Дыялогі пра жывёлаў. Лора Парк. Тэнэрыфэ.
**14.30** «Маленькая сакрэты вялікіх карцін». Дак. серыял.
**15.00** Легендарныя камедыі. Маст. фільм «Муж маёй жонкі» (16+).
**16.20** «Шукальнікі». «Скарбы рускага самурая».
**17.10** «Пешшу...» Асабнякі маскоўскага купецтва.
**17.40** «Блізкае акружэнне Марыны Леонавай».
**18.35** «Рамантыка рамансa».
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Здзяйсненне жаданняў». Маст. фільм (12+).
**21.45** «Белая студыя».
**22.25** «Еранім Босх, д'ябал з крыламі анёла». Дак. фільм.
**23.20** Балет Аляксандра Экмана «Сон у летнюю ноч» (18+).
**2.25** «Шпіёнскія страсці». «Леў і 9 гіен». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966-ы. 2009 год (12+).
**6.50** «Залатая рыбка». Тэлеспектакль. 1986 год (12+).
**8.25** «Ранішняя пошта». 1989 год (12+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.45, 11.00, 14.20, 20.25, 21.45, 23.20, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.50** Маст. фільм «Светлы шлях» (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Ганна Пятроўна» (16+).
**18.20, 0.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**19.20** «Майстры мастацтваў». Яўген Лявонаў. 1986 год (12+).
**22.00** Маст. фільм «Ваша дачка, Аляксандра...» (12+)
**1.00** Фільм-канцэрт «Вас запрашае Сафія Ратару». 1985 год (12+).
**2.15** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Праблемы сямейнага і халасцяцкага жыцця». 1992 год (16+).

## EuroSport 1

**0.45** Аўтагонкі. Формула Е.
**2.20, 5.00, 8.30, 17.45, 21.00, 22.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**3.30, 6.30** Снукер. Welsh Open.
**6.00, 20.00, 23.15** Біятлон. Кубак свету.
**10.00** Конны спорт. Longines Masters.
**12.30, 16.00, 19.15, 22.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету.

## Кінакамедыя

**1.00** Аксамітныя ручкі (16+).
**2.55** Супергеройскае кіно (16+).
**4.25** Ультраамерыканцы (18+).
**6.15** Вялікі салдат (16+).
**8.10** Шпіён па суседстве (12+).
**10.00** Спадарыня пакаёўка (12+).
**12.00** Вясельны перапалох (16+).
**14.00** Вялікае вяселле (16+).
**15.40** Прачнуўшыся ў Рына (16+).
**17.25** Красуня на ўсю галаву (16+).
**19.30** Каханне прэт-а-партэ (12+).
**21.10** Усё пра мужчын (16+).
**22.40** Муві 43 (18+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**9.30** «Заўтра сёння» (12+).
**10.05, 5.20** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**10.55** «Глядзі сам» (12+).
**11.20, 1.15** «Маскоўскі дворык». Серыял (16+).
**15.10** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**16.35** «Снайпер. Зброя адплаты». Серыял (16+).
**20.15** «Без падману» (16+).
**21.10** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**21.45** «Дзённікі няні». Меладрама (12+).
**23.50** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**4.35** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 15.30** Джулі і Джулія: гатуем шчасце па рэцэпце (12+).
**8.30** Іншыя (16+).
**10.30** Бандыты (16+).
**13.15** Пабочны эфект (16+).
**18.05** Эван Усемагутны (12+).
**20.10** Немагчымае (16+).
**22.30** Герцагіня (16+).
**0.40** Прабач, хачу з табою ажаніцца (12+).
**3.05** Рэальнае каханне (16+).
**5.45** Рамэа і Джульета (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Канікулы строгага рэжыму (12+).
**8.35** Няўлоўныя: Бангкок (16+).
**10.20** Пра любоў (16+).
**12.35** Анкор, яшчэ анкор! (16+)
**14.35** Кіліманджара (16+).
**16.20** Параграф 78. Фільм другі (16+).
**18.20** Кіно пра Аляксеева (12+).
**20.20** Кахае не кахае (16+).
**22.05** Няўлоўныя: джэкпот (16+).
**23.45** Заложнікі (18+).
**1.45** Каханне ў вялікім горадзе (16+).
**3.20** Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
**4.50** Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).

## National Geographic

**0.20** Невядомы Кітай (16+).
**2.00** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**2.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**4.20** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**4.50** У пагоні за НЛА (16+).
**5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25** Мегазаводы (16+).
**8.05** Сапраўдны суперкар (16+).
**9.35** Дзікі тунец (16+).
**12.00** Экстрэмальныя даследчыкі (16+).
**13.30, 21.20** Захавальнікі скарбаў Егіпта (16+).
**14.15** Выратаванне найстаражытнейшай піраміды Егіпта (16+).
**15.00** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў (16+).
**15.50** «Youtube: рэвалюцыя» (16+).
**16.35** Асушыць акіян (16+).
**18.10, 22.00** 1989 год, які стварыў сучасны свет (16+).
**19.45** Вялікі канал Кітая (16+).
**20.30** Шандун: краіна Канфуцыя (16+).
**22.50** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00, 18.00** Як гэта зроблена?
**10.00** Невядомая экспедыцыя.
**11.00** Залатая ліхаманка.
**12.00, 2.55** Разбуральнікі легенд.
**13.00, 23.00** Музейныя тайны.
**14.00, 4.40** Мужчынскія бярлогі.
**15.00, 3.50** Апошнія жыхары Аляскі.
**16.00** Скарбы з каморкі.
**20.00** Вулічная навука.
**0.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**1.00** Самагоншчыкі.
**2.00** Загадкавыя знікненні.
**5.30** Паляўнічыя на старызну.
**7.10** Круты Чэд.

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена.*

# КАЛЯ ХАТЫ

## возяць на заняткі аўтобусамі ў Іванаўскім раёне

Цікава, што маршрут наведвання вёсак «плавае». Калі, скажам, сёлета першы рэйс аўтобус робіць у Шчакоцк, то налета ён зранку будзе ехаць у Замошша. Такім чынам, вучні з адной вёскі змогуць паспаць крыху больш, а на наступны год — з другой.

### Конкурсы, алімпіяды, экскурсіі

Аўтобус для сельскай школы гэта не толькі своечасовая дастаўка на ўрокі. Гэта яшчэ магчымасць удзельнічаць ва ўсіх раённых мерапрыемствах, конкурсах, алімпіядах, а таксама экскурсійнай дзейнасці. Вось у наступную суботу запланавана паездка групы вучняў у Псышчаўскую школу на канферэнцыю па развіцці радыёэлектронікі, расказваюць настаўнікі, потым пачнуцца прадметныя алімпіяды.

— Наўрад ці мы паўдзельнічалі б у стольких агульных справах, каб не былі на колах,— разважае дырэктар Святлана Ляхавец. — Добра памятаю тыя часы, калі вазілі вучняў на падобныя мерапрыемствы рэйсавым аўтобусам. Гэта ж трэба было паспець, падстроіцца пад расклад яго руху. А цяпер і аўтобусаў стала менш, у некаторыя вёскі яны ходзяць ледзь не раз на тыдзень.

Да таго ж усе памятныя мясціны свайго раёна з кожным класам аб'язджаем: музей Дастаеўскага ў Дастоеўскай школе, карцінную галерэю Напалеона Орды ў Варацэвічах, мотальскія музеі — грэх было б не ведаць славутасці малой радзімы. Таму перыядычна выбіраемся на экскурсіі.

Святлана Мікалаеўна родам з Дружылавіч, згадала, як крыху старэйшыя яе аднавяскоўцы хадзілі ў школу ў Дастоева за восем кіламетраў (гэта ў добрае надвор'е напрамкі), а калі ў абход, то і больш атрымлівалася. А дзеці і ўнукі іх маюць зусім іншыя ўмовы.

### Абед — бясплатны

У Шчакоцку мы спыніліся каля першай хаты ад прыпынку. Насустрач выйшла гаспадыня, аказалася, шматдзетная маці — Любоў Валошына. У Любові Іванаўны трое школьнікаў — сямікласнік Улад, шасцікласнік Арцём і Яна, вучаніца 2 класа. Раней, калі сям'я пераехала ў гэты дом, дзяцей самі бацькі вазілі ў горад у школу, а з гэтага года перавялі ў Дружылавіцкую. Цяпер маці не нарадуецца: «Стала зручна, прыпынак каля самай хаты. Выбеглі ранкам, з акна бачаць, як аўтобус падыходзіць, і заехалі. З заняткаў прыехалі, нам не трэба ні адвозіць, ні забіраць. У суботу таксама ездзяць на секцыі, гурткі. Я іншым разам прапаноўвала дома застацца, не згаджаюцца, ім там падабаецца».

Любоў Іванаўна родам са Століншчыны. Таму не дзіўна, што на яе сядзібе ўстаноўлена некалькі радоў цяпліц. Разам з мужам яны займаюцца вырошчваннем агародніны. Работы хапае, а за дзяцей спакойныя. Тым больш што тыя заўсёды не проста дагледжаныя, але і смачна



Кіроўца Сяргей БУЧЫК, настаўніца Таццяна РАЙКЕВІЧ.

накормленыя. Усе вясковыя вучні атрымліваюць гарачы абед бясплатна. А дзеці са шматдзетных сем'яў на такіх жа ўмовах забяспечваюцца двухразовым гарачым харчаваннем, калі яны займаюцца ў групе падоўжанага дня.

**Загадчык сектара аддзела адукацыі Іванаўскага райвыканкама Уладзімір БЭНДА** расказаў, што ў гэтым навучальным годзе ў сельскія школы раёна арганізаваны падвоз 934 вучняў. Падвоз арганізуюць 18 аўтобусаў. Большая частка з іх захоўваецца на вытворчай базе ў Ляскавічах.

Па дарозе ў школу мы зазірнулі ў гэты вялікі гараж. Там стаяла некалькі аўтобусаў. Кіроўца Віктар Гарбацэвіч рыхтаваў сваю машыну да выезду. Віктар Аляксандравіч, як і яго калега з Дружылавіч, машыну атрымаў у 2006 годзе. Ёсць старэйшыя машыны, ёсць і навейшыя, парк іх увесь час папаўняецца.

**Алена ДАРАГАКУПЕЦ, старшыня Іванаўскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Працэс аптымізацыі сельскіх школ непазбежны. Невялікія школы закрываюцца. Летась у раёне закрылі адну школу, яшчэ адна рыхтуецца да закрыцця ў наступным навучальным годзе. Але дзяржава робіць усё, каб дзеці не адчулі нязручнасці, каб яны ў любое надвор'е заўсёды своечасова прыступілі да заняткаў. У адным толькі нашым раёне на падвоз дзяцей і забеспячэнне прадуктамі сельскіх школ траціцца 15 тон бензіну штомесяц.

Не так даўно пра сельскія школы давялося гутарыць з польскімі калегамі. У іх тыя ж праблемы. Яны, дарэчы, падвозяць дзяцей у школу нават за 60 кіламетраў. Там таксама ёсць школьныя аўтобусы, але гэта паслуга для бацькоў — платная. У нас жа затраты цалкам бярэ на сябе дзяржава.

Сістэма падвозу адпрацаваная гадамі і добра функцыянуе. Калі ж здараюцца скаргі альбо прапановы, то яны, як правіла, датычацца прыпынкаў. Скажам, бацькі просяць зрабіць прыпынак каля іх дома, нягледзячы на тое, што аўтобус забірае іншых школьнікаў на адлегласці, напрыклад, трох дамоў. Як правіла, у такіх выпадках хапае тлумачэння. Нярэдка аказваецца, што самі бацькі ў свой час хадзілі ў школу за некалькі кіламетраў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# ПАМЯЦЬ У ГРАНІЦЕ

Так атрымалася, што Савініцкую школу ў Клімавіцкім раёне закрылі, калі ёй павінна было споўніцца 100 гадоў. Спачатку драўляная, потым цагляная — яна б прастаяла, напэўна, яшчэ столькі, калі б не чарнобыльская трагедыя. Вёска, а з ёй і школа перасталі існаваць у 1991 годзе. А ў 2015 годзе нечакана пачалося другое жыццё школы, гэтым разам у граніце. Каля сотні былых вучняў вырашылі захаваць дарагую сэрцу памяць. Помнік з'явіўся ў аграгарадку Ціманава, менавіта там у Доме культуры штогод збіраюцца былыя выпускнікі.



— Мы патрыёты, вось ужо будзе 11 гадоў, як рэгулярна сустракаемся кожную трэцюю суботу чэрвеня, — кажа выпускніца 1967 года Лідзія Антонава. — Нам самім ужо некаторым па 70 гадоў, нашы настаўнікі-франтавікі даўно пайшлі з жыцця, але мы з удзячнасцю іх успамінаем. Першы раз сабралася болей за 200 чалавек, але і зараз прыязджае не меней за 50. Некаторыя едуць нават з Амерыкі.

— Помнік прысвечаны Савініцкай школе і пачатковым, якія таксама сцёр з зямлі Чарнобыль — Гарадзешня1, Студзянец, Дзяражня і Цітаўка, — удакладняе Валянціна Халадзінская (у школе Іванова). Менавіта яна адкрыла ў Мінску рахунак для збору сродкаў. А Лідзія Васілеўна Іванова (Шавялёва) займалася пытаннямі ўстаноўкі помніка школе, тэлефанавала землякам, пісала ім лісты. Дзякуючы яе намаганням была сабрана большая частка грошай. Яшчэ адзін выпускнік, Леанід Паўлавіч Цыркуноў, стаў сапраўдным біёграфам школы, дзе шмат гадоў працавалі настаўнікамі яго бацькі. Ён сабраў вельмі багаты архіў, у тым ліку і фота, прысвяціў установе і яе выпускнікам некалькі відэаролікаў.



Усе гэтыя людзі клапоцяцца, каб сустрэчы не прыпыняліся і школа працягвала жыць у памяці. Кажуць, што стасункі з дарагімі сэрцу людзьмі падаўжаюць жыццё. Ініцыятары школьных сустрэч у гэтым перакананыя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЗАКОНА

выводзіцца на вахту, дзе вядзецца кантроль за падвозам прадуктаў і выхадам работнікаў харчовага блока з установы. Першы месяц работы відэасістэмы паказаў яе эфектыўнасць, сцвярджаюць спецыялісты ўпраўлення адукацыі. Таксама ўкаранёна электроннае меню, бацькі школьнікаў разлічваюцца за харчаванне дзяцей праз інтэрнэт.

Такія меры накіраваны на прадухіленне парушэнняў у сістэме школьнага харчавання. Але гэта будуць палавінчатыя меры, калі не будзе наладжаны грамадскі кантроль, лічыць **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.** У гэтым сэнсе могуць дапамагчы БРСМ, бацькоўскія і прафсаюзныя камітэты. Галоўным звяном застаецца адміністрацыя. Пакуль дырэктар сам асабіста не возьмецца наводзіць парадак і не арганізуе работу, вынікам будуць і крымінальныя справы, і зняцце з пасады, і прыцягненне да адказнасці, падкрэслівае Анатоль Дарожка.

— Задача не ў тым, каб пакараць кухара ці загадчыка вытворчасці, а ў тым, каб і харчаванне ў школах і выкарыстанне бюджэтных сродкаў было эфектыўным і рацыянальным, — канстатуе старшыня КДК Гродзеншчыны. — Пакуль складана гаварыць аб станоўчых выніках. Як паказаў снежаньскі маніторынг, праблемы застаюцца. Мы праверылі тры ўстановы адукацыі, і ва ўсіх ёсць парушэнні. Між тым у Гродзенскай вобласці праз сістэму камбінатаў школьнага харчавання праходзіць крыху больш за палову ўсіх школьнікаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### У ТЭМУ

**Алена АЛЯХНОВІЧ, дырэктар СШ № 28 Гродна, дэпутат гарадскога Савета дэпутатаў:**

— У нашай школе ахоплена харчаваннем 99 % школьнікаў. Дасягнуць такога выніку дапамагло ўкараненне шведскага стала для вучняў 6—11 класаў. Эксперымент аказаўся ўдалым.

Вялікі асартымент салатаў, сокаў, садавіны і гарачых страў дазваляе кожнаму выбраць тое, што яму падабаецца, гэта значыць, што харчаванне не толькі правільнае, але і смачнае. Пры гэтым павысілася і сама культура харчавання, бо школьнікам не навязваюць аднолькавыя стравы, а прапануюць самім зрабіць выбар. Улічваецца і дыетычнае харчаванне. Дзяўчаты-старшакласніцы выбіраюць часцей салаты і нешта мяснае, у хлопцаў больш шырокі асартымент.

Некалькі гадоў таму ў школе поўнасцю аднавіўся харчовы блок, устаноўлена відэаназіранне. Мы замянілі ўсё абсталяванне на сучасныя тэхналогіі. У нас устаноўлены параканвектамат — шафа для смажання, якая дазваляе гатаваць некалькі страў.

У школе вядзецца пастаянны кантроль за якасцю прыгатавання страў. За арганізацыяй харчавання сочыць бракеражная камісія, савет па харчаванні, савет старшакласнікаў, прадстаўнікі бацькоўскага камітэта, дзяжурны адміністратар. Загадчык харчовага блока — наша былая вучаніца, яна вельмі стараецца, каб дзеці харчаваліся і смачна, і якасна.

# БЫЛА ШКОЛА, СТАЛА... АГРАСЯДЗІБА З КОНЬМІ



**ГЭТА прыклад таго, як удала невыкарыстоўваемая маёмасць уводзіцца ў гаспадарчы абарот. Гарадзецкая базавая школа ў Краснапольскім раёне закрылася ў 2016 годзе, як малакамплектная.**

На той момант у ёй вучылася каля 20 чалавек. Але будынак з поспехам быў рэалізаваны мясцоваму прадпрымальніку Юрыю Зямцову за адну базавую велічыню. Зараз тут вядзецца будаўніцтва аграсядзібы, дзе можна будзе не толькі адпачыць з камфортам, але і пакатацца на конях. Побач з аграсядзібай будуецца яшчэ і стайні для трох дзясяткаў гэтых прыгожых жывёл.

— У нас у раёне прадстаўнічая ўлада добра супрацоўнічае з бізнесам, — кажа **старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН.** — Як вынік з'яўляюцца новыя запатрабаваныя аб'екты. Трэба адзначыць, што Юрый Зямцоў не толькі прадпрымальнік, які працуе на карысць сваёй малой радзімы, але і дэпутат сельскага і раённага Саветаў дэпутатаў. Да гэтай справы ставіцца з не меншай адказнасцю, чым да сваёй асноўнай дзейнасці. Сярод жыхароў раёна ён карыстаецца вялікай павагай. Ёсць спадзяванні, што яго турыстычны аб'ект прыцягне ў раён дадатковыя сродкі і стане яшчэ адным яго брэндам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



# АДУКАЦЫІ АПТЫМІЗАЦЫЯ НА КАРЫСЦЬ

**ПРЫ аптымізацыі ўстаноў адукацыі на Віцебшчыне заўсёды прадумваюцца ўсе «за» і «супраць». За гэты час закрылі каля 220 школ і садкоў.**

Кіраўнікі мясцовай улады абласнога і рэгіянальных узроўняў неаднаразова падкрэслівалі, што зачыняюцца ўстановы выключна там, дзе іх функцыянаванне не рацыянальнае. Маецца на ўвазе, калі вучняў вельмі мала, ёсць магчымасць перавесці на вучобу ў школы ў суседніх населеных пунктах. Калі трэба, прапануюць пражыванне ў прышкольных інтэрнатах...

Вялікі плюс аптымізацыі ў тым, што грошы, якія эканомяцца, выдаткоўваюць выключна на патрэбы сістэмы адукацыі. З гэтага года, дарэчы, фінансаванне залежыць ад колькасці вучняў. І школы павінны быць зацікаўленыя, каб дзяцей было больш.

> Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў прапанаваў беспрацоўным настаўнікам станавіцца прыёмнымі бацькамі. І такім чынам яны будуць атрымліваць зарплату, а педагагічны вопыт стане гарантыяй усебаковага развіцця дзяцей.

У ліку іншага сэканомленыя грошы «акумулююцца» на пакупку камп'ютараў і іншага абсталявання, без якога нельга абысціся ў век «высокіх тэхналогій». Сёлета каля 80 % школ павінны функцыянаваць у рамках праекта «Электронная школа». Пакуль што лічбавымі сэрвісамі карыстаюцца больш чым у палове ўстаноў сярэдняй адукацыі.

Каб забяспечыць дастаўку дзятвы ў школы і ў населеныя пункты, толькі сёлета плануецца набыць больш за сорак школьных аўтобусаў. Акрамя іншага, запланавана сёлета абнавіць школьныя харчаблокі...

Што датычыцца педагогаў, па магчымасці ім прапаноўваюць новыя месцы работы ва ўстановах адукацыі. Дарэчы, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў на мінулым тыдні падчас семінара з удзелам народных выбраннікаў прапанаваў беспрацоўным настаўнікам станавіцца прыёмнымі бацькамі. І такім чынам яны будуць атрымліваць зарплату, а педагагічны вопыт стане гарантыяй усебаковага развіцця дзяцей, якіх яны будуць выхоўваць. Ідэя агучваецца між іншым не першы раз.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

У пачатку новага навучальнага года ў Прыдзвінскім краі функцыянуюць 535 устаноў дашкольнай адукацыі і 376 школ, паведамілі ў галоўным статыстычным упраўленні Віцебскай вобласці. Адпаведна ў спісе дзяцей — 50,5 і 111,8 тысячы чалавек. Цікава, што колькасць першакласнікаў павялічылася на 1,7 % у параўнанні з пачаткам мінулага навучальнага года. Імі сталі 11,8 тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак.

Што датычыцца будынкаў былых школ і садкоў, іх выкарыстанне павінна быць больш эфектыўным. За гэтым сочаць і ў Камітэце дзяржкантролю Віцебскай вобласці. Летась нашага карэспандэнта ўзялі ў рэйд у школы, якія зачыніліся. У рэпартажы гаварылася, што за сем гадоў аптымізацыі дзейнасці ўстаноў адукацыі было закрыта больш за 210 школ і садкоў, пераважна ў сельскай мясцовасці. У 2018 годзе закрылі толькі сем устаноў адукацыі... Сярод іх — у вёсцы Пішчалава Аршанскага раёна, дзе пабываў журналіст з прадстаўніком кантрольнага ведамства. Дарэчы, за тое, што не быў забяспечаны кантроль за захаваннасцю аб'екта нерухомасці, потым па прадстаўленні камітэта прыцягнулі да адказнасці трох асоб.

У выніку закрытую школу купіў бізнесмен, які ў населеным пункце валодае фірмай па вырабе прадукцыі з лячэбных траў. Цяпер дзякуючы прадпрымальніку ў спартыўнай зале займаюцца фізкультурай вяскоўцы. Астатнюю частку будынка плануецца выкарыстоўваць у вытворчых мэтах.

А школу ў вёсцы Кляны суседняга Дубровенскага раёна, дзе мы таксама пабывалі, калісьці выкупіў фермер, каб разводзіць гусей. Чамусьці не атрымалася. На сёння будынак школы не эксплуатуецца. На погляд супрацоўнікаў камітэта, кіраўнікам мясцовай улады трэба больш аддаваць увагі пытанню эфектыўнага выкарыстоўвання дзяржаўнай маёмасці. Усе будынкі павінны быць у добрай захаванасці, каб потым іх выкарыстоўваць у гаспадарчым абароце. Пытанне знаходзіцца пад пільным кантролем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 марта 2019 года проводит 5-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 52 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Кузов-фургон К-66 № Б/Н056294 1980 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0209390 дв. 2080030 1980 г. *4 кат. 996 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 000,00 | 800,00 |
| 53 | ПСГ-160(130) (перекачивающая станция горючего) на ЗиЛ-130 грузовой 1978 г. ш. 1560117 инв. № 01580082 *пробег 9 720 км* | г. Гомель, областное УМЧС | 5 100,00 | 1 020,00 |
| 54 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0164924 инв. № 015102011979 г. *пробег 2 366 км.* Кузов-фургон К-66 1979 г. | г. Гомель, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 55 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0138325 инв. № 015102021978 г. *6 109 км.* Кузов-фургон К-66 1978 г. | г. Гомель, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 56 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66 ш. 0567702 инв. № 013502091989 г. *860 км.* Кузов-фургон К-66 1989 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 300,00 | 860,00 |
| 57 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. ХТН006615J0536860 инв. № 01350214 1988 г. *1 103 км.* Кузов-фургон К-66 1988 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 58 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. ХТН006615I0550253 инв. № 01350208 1988 г. *пробег 1 018 км.* Кузов-фургон К-66 1988 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 59 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. ХТН006615I0554477 инв. № 01350213 1988 г. *1 113 км.* Кузов-фургон К-66 1988 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 60 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66 ш. ХТН006615К0568590 инв. № 01350215 1989 г. *693 км.* Кузов-фургон К-66 1989 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 300,00 | 860,00 |
| 61 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-04 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-04 ш. 0290987 инв. № 01350210 1982 г. *2 300 км.* Кузов-фургон К-66 1982 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 62 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе. Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0313869 инв. № 01350462 1982 г. *2 674 км.* Кузов-фургон К-66 1982 г. | г. Гродно, областное УМЧС | 4 000,00 | 800,00 |
| 63 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160(431410)скл.с/о 76 на ЗиЛ–431410 ш. 2476230 дв. 604182 1986 г. *4 кат. 1 618 км* | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 64 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160(130) скл. с/о 5209 на ЗиЛ–130 ш. 2109802 дв. 886218 1983 г. *4 кат. 4 7042 км* | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 4 500,00 | 900,00 |
| 65 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160(130) скл. с/о 05 на ЗиЛ–130 ш. 2180513 дв. 025082 1984 г. *4 кат. 2 142 км* | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 4 500,00 | 900,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **14 марта 2019 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 11 марта 2019 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **14 марта 2019 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **Без НДС**. **Справки по тел./факс (017) 398 05 41**



## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Гомельский ЭМЗ»

**Лот № 1.** Тарное отделение, инв. № 350/С-78157. Площадь – 206,3 кв. м. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Калинина, 22А. **Начальная цена, – 43 200,00 бел. руб. с НДС. Задаток – 4 500,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**Обременение:** аренда здания тарного отделения по 01.01.2023

**Земельный участок:** кадастровый номер 340100000005007472, 0,0465 га. Право аренды. Срок действия: по 15.08.2037. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен зарегистрировать сделку в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания договора купли продажи Объекта.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость, приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь по 12.07.2013 № 609, составляет 8 000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 11.03.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Гомельский ЭМЗ», 245014, г. Гомель, ул. Калинина, 22, тел. 8 (0232) 95-25-13.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11 пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Гомельский ЭМЗ», проводимом 11.03.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 06.03.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Бондаренко Светлана Васильевна, тел.: 8 (0232) 95-26-11, 8 (044) 552-01-06

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# «Бізнес-клімат трэба паляпшаць»

## Сенатар Анатоль ГРЫШУК аб перспектывах эканомікі, праблемах будаўнікоў і малой радзіме

**АНАТОЛЯ Георгіевіча без перабольшвання можна назваць адной з самых уплывовых асоб на Гродзеншчыне. Ён актыўна спалучае сваю службовую дзейнасць з грамадскай, мае нямала ўзнагарод. Аб яго высокім прафесіяналізме сведчыць той факт, што Анатоль Грышук больш за 30 гадоў узначальвае ААТ «Гродзенскі мясакамбінат». Зараз вядзе актыўную заканатворчую дзейнасць як член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах.**


Фота Мікалая ЛАПІНА.

**— Анатоль Георгіевіч, наша сустрэча праходзіць падчас прыёму грамадзян, якую вы толькі што завяршылі. З чым да вас прыйшлі гродзенцы?**

— Сёння па асабістым пытанні звярнулася жанчына. Яна хоча працаўладкавацца па сваёй спецыяльнасці — бактэрыёлагам, гэта рэдкая спецыяльнасць. Я прыняў рашэнне яе працаўладкаваць на наша прадпрыемства. Якраз ёсць вакансія.

Таксама прыходзілі «афганцы», сёлета юбілей вываду войскаў з Афганістана, і яны хочуць дастойна адзначыць гэтую падзею. У прыватнасці, паехаць у партызанскі лагер, які створаны на нашым агратурыстычным комплексе, я іх падтрымаў. Звярнуліся да мяне прадстаўнікі прыватнага прадпрыемства, у якога мясакамбінат закупляе каўбасную абалонку. Яны збіраюць пашырацца і цікавіліся, якія зараз патрэбы ў нашага мясакамбіната.

**— Як відаць, вам не складана вырашаць пытанні на мясцовым узроўні. А як наконт агульнарэспубліканскіх праблем? Якія з іх патрабуюць вырашэння на заканадаўчым узроўні?**

— Зараз адна з актуальных праблем — гэта будаўнічая галіна. Нядаўна па гэтай тэме ў Смалявіцкім раёне прайшло выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі з наведваннем індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

Гэта асобая эканамічная зона, рэзідэнтамі якой сталі каля 15 краін і ўжо пачалі рэалізацыю на яго тэрыторыі буйных будаўнічых і прамысловых праектаў. Гэта глабальная пляцоўка як для прыцягнення інвестыцый, так і абмену сусветным вопытам у розных сферах. У рамках пасяджэння абмяркоўвалі многія аспекты будаўнічай галіны.

Другое пасяджэнне па названай тэме мы правядзём у хуткім часе ў Ваўкавыску. Пытанняў шмат. Трэба разабрацца з неплацяжамі, бо вялікая запазычанасць перад будаўнікамі ў АПК. Таксама нервовае пытанне — нарматыўныя дакументы.

Прывяду такі прыклад. Склалі будаўнікам праект, тэрмін рэалізацыі — чатыры гады. За гэты час змяняюцца пажарныя, санітарныя нормы і іншае. Аб'ект пабудаваны, а здаць яго немагчыма з-за новых правілаў. І хто тут вінаваты? Такія пытанні трэба ўлічваць на заканадаўчым узроўні. Увогуле, у хуткім часе будаўнічую галіну закране шэраг новых рашэнняў, якія дапамогуць выйсці на больш высокі канкурэнтны ўзровень.

Добра тое, што нарэшце будаўнікоў пачулі. Раней наогул ніхто не прыслухоўваўся да гэтых довадаў. Маўляў, будуйце, згодна з праектам.

**— Вы заўважылі, што індустрыяльны парк «Вялікі камень» добра працуе з інвестыцыямі. Але гэтыя інвестыцыі патрэбны паўсюдна. Ці хапае іх зараз на мясцовым узроўні?**

— Мы будзем разглядаць у Ваўкавыску на пасяджэнні Пастаяннай камісіі гэту найважнейшую для краіны тэму: чаму іх такі мізэр. І гэта пры тым, што у нас даволі льготнае крэдытаванне. Напрыклад, мы будавалі прадпрыемства па крэдытах пад 300 % гадавых. І многія тады казалі: дайце нам 15 % гадавых, і мы перавернем свет. Зараз на гэтай планцы працуюць, але чамусьці ніхто нічога не пераварнуў. Таму што ўсё змяняецца, і цяпер 15 % — гэта дорага. Напрыклад, нашаму прадпрыемству трэба канкурыраваць гатовым прадуктам з Еўропай, дзе крэдыты складаюць 2—3 %, і гэта стала праблемай. Але ў нас няма іншага шляху, як шукаць выйсце. У Ваўкавыску мы якраз паслухаем усіх — і бізнесменаў, і банкіраў, і ўлады... Лічу, што патрэбны максімальныя льготы. Да той пары, пакуль сітуацыя не стабілізуецца, бізнес-клімат трэба паляпшаць.

**— Вы ўзначальваеце абласны клуб прадпрымальнікаў, што цяпер іх хвалюе?**

— Цяпер крэдыты даступныя, але шмат іншых перашкод у развіцці. Напрыклад, дарагі газ, што таксама адбіваецца на экспартным патэнцыяле. Я ведаю дзве фірмы, якія будуюць заводы ва Узбекістане, таму што там танная рабочая сіла. Для дзяржаўнага бізнесу галоўны бізун — паператворчасць.

**— Ваша прадпрыемства — гэта даволі буйны холдынг, у якім ёсць нават былы калгас. Як вы ставіцеся да далучэння слабых гаспадарак да моцных? Ці дапаможа гэта падцягнуць іх?**

— Вы не думайце, што далучаюць, каб перакачаць грошы ад багатага да больш слабага. Яны павінны падцягнуцца за кошт моцных менеджараў, якія будуць шукаць там недапрацоўкі і рэзервы. І прыкладаў у нашым рэгіёне нямала, калі адна гаспадарка, больш моцная, «праглынула» слабейшую. І гэты працэс ідзе. Нядаўна пачаў дзейнічаць указ, які дае магчымасць адтэрміноўкі плацяжоў. Не ўсе прадпрыемствы змогуць падняцца, дзякуючы гэтаму ўказу, калі палова падымецца — гэта будзе поспехам.

**— На прыкладзе вашага прадпрыемства, як бы вы ацанілі дыверсіфікацыю экспарту?**

— Каб выходзіць на экспарт, трэба мець прадукт. Як мы робім? Укладаем інвестыцыі ў новую вытворчасць. Некалькі гадоў таму пабудавалі цэх па выпуску сыравэнджанай каўбасы. Мы выраблялі 80 тон у месяц і прадавалі, а тут замахнуліся на 500 тон. І праз паўтара года ўжо прадавалі не 500, а амаль 700 тон. Мы раскруцілі прадукт у Расіі, цяпер у нас гатовы браць і Казахстан, і Азербайджан. Для іх мы робім каўбасы з ялавічыны.

Так, Расія — выгадны партнёр. Але ёсць рызыка ў санкцыях. Сёння закрытыя на гэты рынак два гродзенскія прадпрыемствы — у Слоніме і Ашмянах, якія ўваходзяць у наш холдынг. Адзінае, аб чым можна сур'ёзна гаварыць — гэта Кітай. Наша вобласць сябруе з правінцыяй Ганьсу. Уяўляеце — правінцыя — 20 мільёнаў чалавек! Губернатар быў на нашым прадпрыемстве, і ён уплывовы чалавек у Кітаі, нядаўна мне патэлефанаваў, сказаў, што мы адпавядаем усім іх стандартам. І ўжо ёсць заданне і даручэнне — адкрыць для гродзенцаў шлях на Кітай. Лагістыка, канешне, складаная, але замацавацца там — гэта вялікая справа. І свініну яны таксама развіваюць.

**— Вы адзін з нямногіх у краіне, хто мае такую незвычайную ўзнагароду — ордэн Усмешкі. Я ведаю, што яго ўручаюць за заслугі перад дзецьмі...**

— Гэта міжнародны ордэн ад Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у мяне ён за нумарам 552. У Савецкім Саюзе першым яго атрымаў заснавальнік маскоўскага тэатра лялек Сяргей Абразцоў. І для мяне вялікі гонар мець такі ордэн з выявай сонца на стужцы. Я заўсёды нашу яго 1 чэрвеня, у дзень абароны дзяцей. Мы праводзім штогод у сваім агратурыстычным комплексе дабрачыннае свята, усё бясплатна, прыходзіць 600—700 дзяцей, мы рыхтуем для іх падарункі.

**— Сутыкаецеся вы з расчараваннямі?**

— У жыцці без гэтага немагчыма. Мяне расчароўваюць сітуацыі, калі яны суб'ектыўнага характару. Калі нехта недапрацаваў у плане прыняцця рашэнняў, калі людзі бяруцца не за сваю справу. Бяруцца за гуж, а потым не могуць яго пацягнуць... Я не расчароўваюся, калі, напрыклад, выпала шмат снегу і цяжка праехаць, ці калі рыба не клюе...

**— Што вы цэніце ў чалавеку?**

— У жанчыне?

**— Увогуле...**

— Я перш за ўсе цаню аптымізм, калі ён не ные, а ставіць перад сабой абгрунтаваную мэту і дасягае яе, а можа, нават і перабольшвае. Гумар цаню, калі чалавек любіць гумар — гэта добры чалавек... Цаню прафесіяналаў у любым плане.

**— Вы родам з Берастаўіцкага раёна. Што для вас малая радзіма і як вы яе ўшаноўваеце?**

— Бываю там, і апошняе, што там зрабіў — у сваёй вёсцы Галынка за ўласныя сродкі паставіў вялікі прыгожы крыж на месцы былога храма. Падчас вайны храм быў разбураны, усё было зарослае. Адзін веруючы чалавек мне падаў такую ідэю. Есць ідэя працягнуць гэты праект і добраўпарадкаваць нашу рачулку.

Трэба паглядзець на вопыт іншых краін і, можа, у далейшым распрацаваць праграму па ўзнаўленні малых рэчак. Калі рабіць прадумана і паэтапна, грошы знойдуцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


### Логойский сельский исполнительный комитет проводит 12 марта 2019 года открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Августово, ул. Высокая, 5А, 623284600201000312 | 0,0997 | газо-, электроснабжение | 6 000,00 | 1659,89 + реклама | 600,00 |
| 2 | д. Пархово, У-5, 623284604501000064 | 0,1504 | электро-, водоснабжение | 3 000,00 | 701,36 + реклама | 300,00 |
| 3 | д. Слаговище, У-3, 623284605301000041 | 0,1169 | | 2 000,00 | 1317,02 + реклама | 200,00 |

Земельный участок в д. Августово, ул. Высокая, 5А имеет ограничения в использовании площадью 0,0031 га в связи с расположением в охранных зонах электрических сетей.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на № BY25AKBB36006191011030000000 БИК AKBB BY 2X, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код – 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 12 марта 2019 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. **Последний день приема заявлений 5 марта 2019 года до 17.00.** Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11



### Отчет об использовании своего имущества за 2018 год

Количество учредителей благотворительного местного фонда «Открытые сердца» – 1 человек, из них 1 – физические лица.

Единица измерения тыс. бел. руб.

Информация о стоимости имущества благотворительного местного фонда «Открытые сердца» (далее – Фонд):

– остаточная стоимость основных средств на 31.12.18 г. составляет 0,3 тыс. бел. руб., в том числе:

видеокамера «Панасоник» – 0,3 тыс. бел. руб.

– Поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 45,6 тыс. руб., в том числе дотации из ФСЗН – 7,6 тыс. бел. руб.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 42,1 тыс. бел. руб. В том числе:

– на выплату заработной платы, пособия по уходу за ребенком и хозяйственных расходов 35,6 тыс. бел. руб.;

– на оплату налогов и обязательных платежей из ФЗП 2,1 тыс. бел. руб.;

– на оплату поставщикам (буклеты, листовки, аренда и прочее) 3,6 тыс. бел. руб.;

– прочие платежи (вознаграждения банку и др.) 0,8 тыс. бел. руб.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790627109



### Информация о внесении изменений в извещение о проведении аукциона

В извещении о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Игнатичи», опубликованном в газете «Звязда» от 01.02.2019 на стр. 6, вносятся следующие изменения:

«**Условия продажи коровника и телятника:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее двух лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;

– приступить к реконструкции (строительству) в течение одного года с момента утверждения проектно-сметной документации;

– осуществление реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию» УНП600041893



### ОТЧЕТ
### Местного благотворительного культурно-исторического Фонда памяти Первой мировой войны «Крокі» по использованию своего имущества за 2018 год

– Количество учредителей – 3.
– Спонсорская помощь – 996 руб. 95 коп.
– Поступление от проводимых мероприятий – 93 руб.
– % банка.
По состоянию на 1.02.2019 г.:
– остаток на счету
– долгосрочные активы – 28227 руб.
– краткосрочные активы – 4420 руб. 95 коп.
ИТОГО:
Сумма расходов, понесенных на общественно-полезные цели – 996 руб. 95 коп.
Предпринимательская деятельность – не велась.
Хозяйственные общества и УП – не создавались.

УНП 691150277

# БЛАКІТНЫЯ МРОІ

## Ці «прыйдзе» газ у Пагарэльцы?

**Прыродны газ у жылым доме — гэта камфорт, утульнасць. «Блакітнае паліва» здымае шмат праблем і клопатаў, асабліва ў жыхароў сельскай мясцовасці. У чалавека не баліць галава, як ацяпліць памяшканне, дзе здабыць дровы ды іх прывезці. Вядома, усё больш уладальнікаў жылля хочуць як мага хутчэй займець гэтую выгоду ў сябе. Але жаданні не заўсёды супадаюць з рэальнасцю і магчымасцямі...**

«Так здарылася, што ў нашай вёсцы Пагарэльцы да гэта часу не праведзены газ, хоць ва ўсіх суседніх населеных пунктах і амаль ва ўсім Нясвіжскім раёне ёсць газавае ацяпленне. Магчыма, справа ў тым, што мясцовыя ўлады толькі ў ліпені гэтага года паведамілі жыхарам нашай вёскі аб Указе Прэзідэнта № 368, згодна з якім мы маем права на льготнае фінансаванне па газіфікацыі. Амаль адразу, 18 жніўня, быў створаны кааператыў «Пагарэльцы-2018». На раённым узроўні спачатку нас падтрымалі, членамі кааператыва сталі адразу 70 чалавек са 166 пражываючых. Затым — пасля яго рэгістрацыі — падалі заявы яшчэ 14 чалавек. Такім чынам, мець газ у сябе дома жадае ўся вёска Пагарэльцы», — піша наша чытачка Марына Еўдакімава.

Марына Фаустаўна скардзіцца, што, калі справа дайшла да выдзялення грашовых сродкаў на аплату дакументацыі, Нясвіжскі райвыканкам і агракамбінат «Сноў» адмовілі ў дапамозе.

Што датычыцца агракамбіната, то ў Пагарэльцах пражывае ўсяго некалькі яго работнікаў. Пераважная большасць жыхароў — пенсіянеры, былыя работнікі самых розных устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў. Некаторыя з іх у маладосці жылі і працавалі ў іншых гарадах, нават у іншых рэспубліках Савецкага Саюза. А з выхадам на заслужаны адпачынак вярнуліся на сваю малую радзіму ў бацькоўскія хаты.

— Чаму яны не маюць права палепшыць свае жыллёвыя ўмовы? — задаецца пытаннем Марына Еўдакімава. — Указ дзейнічае да 2020 года, бюджэтных грошай мала і на ўсіх не хопіць. Хутка будзе пабудавана атамная электрастанцыя, газіфікацыяй у дзяржаве займацца не будуць, вы проста не паспееце правесці газ да канца 2020-га,— такія адказы чуў старшыня нашага кааператыва, калі звяртаўся да мясцовых улад.

Зразумець хваляванні Марыны Фаустаўны можна. Землякі аказалі ёй высокі давер — выбралі дэпутатам Сноўскага сельскага Савета і ўскладаюць на народнага абранніка свае спадзяванні. А ў сваю чаргу Марына Еўдакімава імкнецца іх апраўдаць.

> Праектаванне новых вулічных размеркавальных газаправодаў з газаправодамі-ўводамі для газіфікацыі ажыццяўляецца ў памеры 70 % — за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і 30 % — за кошт сродкаў грамадзян, якім жылыя памяшканні належаць на праве ўласнасці.

Мы звярнуліся ў Нясвіжскі раённы выканаўчы камітэт з пытаннем: ці могуць пасадзейнічаць членам кааператыва з Пагарэльцаў паскорыць працэс газіфікацыі. Там і рады дапамагчы, але ёсць заканадаўства, парадак чарговасці, якія ніхто не мае права парушыць.

Газіфікацыя эксплуатавання жыллёвага фонду грамадзян ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Указам № 368 у парадку чарговасці. Згодна з Дзяржаўнай праграмай «Спрыяльнае асяроддзе і камфортнае жыллё», першым у чарзе стаіць спажывецкі кааператыў па газіфікацыі «Лань-Міцькавічы». Ён мае гатовую праектна-каштарысную дакументацыю на будаўніцтва газаправода высокага ціску, якая знаходзіцца на экспертызе. Рашэннем выканкама ад 1 кастрычніка 2018 года ўстаноўлена чарговасць праектавання і будаўніцтва аб'ектаў газаразмеркавальнай сістэмы для эксплуатаванага жыллёвага фонду грамадзян раёна на 2019 год. У пераліку два кааператывы — «Лань-Міцькавічы» і «Пагарэльцы-2018». Гэтае рашэнне накіравана ў Мінаблвыканкам для ўключэння ў пералік фінансавання праектавання і будаўніцтва вулічных размеркавальных газаправода (сярэдні ціск). Узвядзенне падводзячага газаправоду высокага ціску ажыццяўляецца за кошт рэспубліканскага бюджэту. Пералік такіх аб'ектаў фарміруецца штогод пасля прыняцця Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце» па хадайніцтве райвыканкама. У спіс уключаюцца аб'екты, якія забяспечаны праектна-каштарыснай дакументацыяй, а таксама фінансаваннем будаўніцтва вулічных размеркавальных газаправодаў (сярэдні ціск) у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта.

Да цяперашняга часу кааператыў «Пагарэльцы-2018» не вызначыўся з фінансаваннем на выраб праектна-каштарыснай дакументацыі на будаўніцтва газаправода высокага ціску. Таму няма магчымасці ўключаць яго ў адпаведны пералік.

Ва ўнітарным прадпрыемстве «Мінскаблгаз» пацвердзілі, што да іх ніхто не звяртаўся па атрыманне тэхнічных умоў, без якіх немагчыма выканаць праектна-каштарысную дакументацыю. Спецыялісты растлумачылі, што паводле Указа № 368 праектаванне новых вулічных размеркавальных газаправодаў з газаправодамі-ўводамі для газіфікацыі ажыццяўляецца ў памеры 70 % — за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і 30 % — за кошт сродкаў грамадзян, якім жылыя памяшканні належаць на праве ўласнасці. Аднак гэты працэс не такі хуткі, як хацелася б, чарга ёсць чарга. Ці можна паскорыць справу? Можна, але ў тым выпадку, калі аб'яднаныя ў кааператывы грамадзяне ўносяць асабістыя грошы за ўсе працы. Аднак, як сведчыць ліст, у Пагарэльцах жывуць практычна адны пенсіянеры, якім цяжка знайсці сродкі на оплату падрыхтоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі. Як толькі члены кааператыва вызначацца з крыніцай фінансавання, справа зрушыцца з месца.

Накont хваляванні нашай чытачкі, што з уводам у эксплуатацыю атамнай электрастанцыі праграма па газіфікацыі будзе згорнутая. Наадварот, у жыхароў Беларусі з'явіцца дадатковая магчымасць — адмовіцца ад дроў, торфабрыкету. Электрыфікацыя або газіфікацыя — гэта прыярытэты ў будучым развіцці. Эканоміка вызначыць і дасць магчымасць чалавеку выбраць крыніцу ацяплення, якая яму выгадная і больш зручная.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37 | | |
| **Предмет аукциона (одним лотом) Месторасположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 9** | | | |
| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Назначение |
| **Административное здание** | 1028,6 кв. м | 610/С-2201 | Здание административно-хозяйственное |
| Составные части и принадлежности: пристройка (1), водопровод (а1), канализация (а2), теплотрасса (а3), ограждение (а4), площадка (а5), тротуар (а6) | | | |
| **Здание служебных гаражей** | 214 кв. м | 610/С-2506 | Здание нежилое – здание служебных гаражей |
| *В состав лота входят* ***многолетние насаждения*** (инв. № 8945) в количестве 16 штук (см. на сайте организатора аукциона – cpo.by) | | | |
| **Сведения о земельном участке: пл. 0,3856** га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административно-управленческого корпуса и служебных гаражей | | | |
| **Обременения**: площади здания частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 051 984,81 бел. руб.** | | | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время проведения аукциона: 13.03.2019 в 11. 00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.03.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

**Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Титова, 24, 12 марта 2019 года**

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 4 капитальных строений (здание гаражей с сауной, здание склада с гаражом и мастерской, здание мастерской, здание бензохранилища), зеленые насаждения |
| Начальная цена продажи | **285 748,80 рубля** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000001000464 площадью 0,3250 га |
| Месторасположение земельных участков | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Титова, д. 24** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152)607302, 745502** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | **8 572,46 рубля** |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | **12 марта 2019 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 11 февраля 2019 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 6 марта 2019 года, 17.00 |

Дополнительные условия:

Площадка по адресу: ул. Титова, 24 в г. Гродно включена в состав функциональной зоны «01см-п» – общественная смешанная пространственно городского ядра и центра. Возможна реконструкция под объект общественной полифункциональной застройки.

Предусмотреть организацию автомобильной парковки для указанного объекта по нормативным требованиям таблицы В. 1 Приложения В ТКП 45-3.01-116-2008 «Градостроительство. Населенные пункты. Нормы планировки и застройки».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 7 лютага 2019 года.**